БАНК ІДЭЙ

# Давер у эпоху перамен: электаральная гісторыя Беларусі (2001–2025)

Алена Шкурова



# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Уводзіны | 3 |
| Метадалогія даследавання | 5 |
| Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя ацэнкі 2004-2025 | 8 |
| Выбары 2001 | 13 |
| Рэферэндум 2004 | 18 |
| Выбары 2006 | 20 |
| Выбары 2010 | 23 |
| Выбары 2015 | 26 |
| Выбары 2020 | 31 |
| Рэферэндум 2022 | 35 |
| Выбары 2025 | 40 |
| Электаральныя сітуацыі (2001-2025). Схема | 44 |
| Высновы | 46 |
| Дадаткі | 49 |

# УВОДЗІНЫ

За апошнія дваццаць пяць гадоў Беларусь прайшла ўнікальную палітычную траекторыю, у якой змена выбарчых кампаній суправаджалася не толькі трансфармацыяй аўтарытарнага рэжыму, але і глыбіннай зменай структуры масавай свядомасці і формаў грамадзянскай суб'ектнасці. З пачатку 2000-х гадоў, калі выбары заставаліся вядучым механізмам палітычнай мабілізацыі і сімвалічным каналам выказвання альтэрнатыў, грамадства паступова пераходзіла ад палярызаванага аўтарытарызму да стану масавай рэзігнацыі, а затым — да беспрэцэдэнтнага выбуху грамадзянскай актыўнасці ў 2020 годзе. Аднак наступны гвалт, рэпрэсіі і сацыяльная дэзінтэграцыя прывялі да нараджэння якасна новага стану масавай свядомасці — палітычнага фаталізму.

Маніторынгавыя дадзеныя ў 25-гадовай перспектыве дазваляюць прасачыць гэтую дынаміку на ўзроўні эмпірычна фіксаваных змен. Яны дэманструюць, што эвалюцыя электаральных паводзінаў і палітычных адзнак у Беларусі не можа быць апісаная ў звыклых катэгорыях "падтрымкі" і "апазіцыйнасці". Пачынаючы з 2010 года зніжаецца не толькі ўзровень даверу да інстытутаў і чаканняў змен, але і сама здольнасць грамадзян успрымаць сябе суб'ектамі палітычнага працэсу. Траўматычны вопыт 2020-2021 гадоў разбурае рэшткі палітычнай агентнасці, пасля чаго ў 2022–2025 гадах фарміруецца новая канфігурацыя: спалучэнне эмацыйнага выгарання, адаптыўнай лаяльнасці і палітычнага фаталізму.

На аснове архіва дадзеных даследаванняў Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі мы ствараем першую ў гісторыі сістэму электаральных дадзеных Беларусі (2001–2025), якая дазволіць даследчыкам і экспертам убачыць поўную карціну дынамікі даверу і палітычнага ўдзелу.

Наша справаздача ўяўляе сабой спробу комплекснай рэканструкцыі электаральнай гісторыі незалежнай Беларусі за першую чвэрць XXI стагоддзя. Даследаванне ахоплівае перыяд з моманту зацвярджэння аўтарытарнай мадэлі (2001 год) да этапу яе "тэхнакратычнай кансервацыі" і рытуалізацыі (2025 год).

Унікальнасць нашай працы заключаецца ў метадалогіі збору дадзеных. Для пабудовы бесперапынных часовых шэрагаў былі аб'яднаны разрозненыя архіўныя дадзеныя Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (2001–2022) і вынікі сучасных незалежных анлайн-даследаванняў (Chatham House, iSANS, 2023–2025). Гэта дазволіла ўбачыць тое, што звычайна ўтоена за афіцыйнай статыстыкай ЦВК: рэальную дынаміку грамадскага даверу, страху і палітычных надзей.

Ключавы фокус даследавання накіраваны не столькі на лічбы галасавання, колькі на трансфармацыю сацыяльнага кантракта. Як грамадства перайшло ад палярызаванай барацьбы пачатку 2000-х да "посткрымскага кансэнсусу" 2015 года, пасля да рэвалюцыйнага выбуху 2020 года і, нарэшце, да стану "палітычнага фаталізму" 2025 года? Дадзены тэкст аналізуе, як мянялася прырода выбараў ва ўспрыманні беларусаў: ад інструмента ўплыву да адміністрацыйнага рытуалу, пазбаўленага палітычнага зместу.

Мэта даследавання — выявіць і прааналізаваць доўгатэрміновыя змены ва ўстаноўках, чаканнях, каштоўнасных арыентацыях і ўспрыманні палітычнага працэсу насельніцтвам, а таксама вызначыць фактары, якія прыводзяць да трансфармацыі электаральных паводзінаў і фармавання палітычнага фаталізму.
Задачы даследавання
1. Рэканструяваць траекторыю зменаў у масавай палітычнай свядомасці на аснове маніторынгавых дадзеных 2001–2025 гг.
2. Прааналізаваць уплыў палітычных крызісаў (2010, 2020, 2022) на змену ўспрымання палітычнага працэсу і індывідуальнай суб'ектнасці.
3. Параўнаць асаблівасці электаральных паводзін у розныя перыяды — ад палярызаванага аўтарытарызму 2000-х да фаталістычнай адаптацыі 2020-х., выявіць пераходныя стадыі.
4. Ацаніць уплыў калектыўнай траўмы 2020-2021 гг. на дэструкцыю палітычнай агентнасці і змены ўспрымання будучыні, даверу і бяспекі.
5. Вызначыць з'яўленне новых ліній сацыяльнага расколу, не заснаваных на падтрымцы ці апазіцыі рэжыму, а на адрозненнях у тыпах адаптацыі.
6. Выявіць механізмы фарміравання палітычнага фаталізму як дамінуючай мадэлі масавай свядомасці ў 2022–2025 гг.

У справаздачы аналізуюцца вынікі маніторынгавых даследаванняў насельніцтва Беларусі за перыяд 2001-2025 гадоў і праводзіцца комплексная рэканструкцыя зменаў у структуры масавых установак. Адмысловая ўвага надаецца пераходу ад мадэляў удзелу і палярызацыі да стану палітычнага фаталізму, а таксама з'яўленню новага тыпу сацыяльнага расколу — паміж унутрана выпаленымі і тэхнакратычна ўбудаванымі групамі. Такі падыход дае магчымасць не толькі растлумачыць асаблівасці паводзін грамадзян у постпратэстнай Беларусі, але і пераасэнсаваць месца выбараў, даверу, чаканняў і інстытуцыйнай бяспекі ў аўтарытарных палітычных сістэмах, якія перажылі глыбокую калектыўную траўму.

# МЕТАДАЛОГІЯ ДАСЛЕДАВАННЯ

Метадалогія праекта грунтуецца на інтэграцыі і уніфікацыі разрозненых баз дадзеных электаральных даследаванняў у Беларусі за 2001-2025 гг. з наступным статыстычным і параўнальным аналізам часавых шэрагаў, фактараў і кропак пераломy ва ўдзеле ў выбарах і ўзроўні даверу да інстытутаў.

Зыходныя дадзеныя праекта:

1. Архіў Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:
   1.1. Электаральнае даследаванне 2001 г.
   1.2. Даследаванне па выніках рэферэндуму 2004 г.
   1.3. Электаральнае даследаванне 2006 г.
   1.4. Перадвыбарнае даследаванне 2015 г.
   1.5. Электаральнае даследаванне 2020 г.
   1.6. Исследование в преддверии референдума 2022 г.

2. Дадзеныя нацыянальнага апытання, праведзенага НІСЭПД па выніках выбараў у 2010 г.[1]

3. Дадзеныя перадвыбарнага даследавання 2025 г. Chatham House[2].

4. Дадзеныя 4 хваль даследаванняў iSANS (2023-2025), якія датычацца сацыяльна-палітычных і эканамічных праблем.

Дадзеныя Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі — рэпрэзентатыўныя даследаванні, заснаваныя на асабістых інтэрв'ю, праведзеных сярод дарослага насельніцтва Беларусі. Выкарыстоўвалася рэпрэзентатыўная выпадковая нацыянальная тэрытарыяльная выбарка з квотнай праверкай на заключным этапе (стандартны памер ад 1500 да 2000 рэспандэнтаў). Апытанні праводзіліся ва ўсіх рэгіёнах Беларусі з захаваннем прапарцыйнага прадстаўніцтва ў адпаведнасці з асноўнымі сацыяльна-дэмаграфічнымі характарыстыкамі насельніцтва (пол, узрост, адукацыя). Выбарачная папуляцыя рэпрэзентатыўная для сямі рэгіёнаў рэспублікі (шэсць абласцей і горад Мінск) і раёнаў пражывання.

Стандартнае размеркаванне рэспандэнтаў па полу, узросце і рэгіёне пражывання

| ТЫП | ХАРАКТАРЫСТЫКА | % |
|---|---|---|
| | да 2019 г.: | |
| Пол | Мужчынскі | 45,8 |
| | Жаночы | 54,2 |
| Узрост | 18-24 | 16,1 |
| | 25-34 | 20,8 |
| | 35-44 | 16,4 |
| | 45-54 | 16,9 |
| | 55-65 | 15,1 |
| | 65 + | 14,8 |

1. "Национальный опрос 21-31 декабря 2010 г.", НИСЭПИ, 5 лістапада 2025
2. "Восприятие избирательной кампании и ситуации в Беларуси", Chatham House, 5 лістапада 2025

| ТЫП | ХАРАКТАРЫСТЫКА | % |
|---|---|---|
| Вобласць | Брэсцкая вобласць | 14,6 |
| | Віцебская вобласць | 13,3 |
| | Гомельская вобласць | 15,3 |
| | Гродзенская вобласць | 11,3 |
| | Мінск | 18,7 |
| | Мінская вобласць | 15,1 |
| | Магілёўская вобласць | 11,7 |
| Тып населенага пункта | Горад | 74,0 |
| | Вёска | 26,0 |

| ТЫП | ХАРАКТАРЫСТЫКА | % |
|---|---|---|
| пасля 2019 г.: | | |
| Пол | Мужчынскі | 44,9 |
| | Жаночы | 55,1 |
| Узрост | 18-24 | 7,6 |
| | 25-34 | 17,1 |
| | 35-44 | 18,8 |
| | 45-54 | 19,3 |
| | 55-65 | 16,6 |
| | 65 + | 20,5 |
| Вобласць | Брэсцкая вобласць | 14,1 |
| | Віцебская вобласць | 12,3 |
| | Гомельская вобласць | 14,2 |
| | Гродзенская вобласць | 10,9 |
| | Мінск | 21,7 |
| | Мінская вобласць | 15,7 |
| | Магілёўская вобласць | 11,1 |
| Тып населенага пункта | Горад | 77,6 |
| | Вёска | 22,4 |

Вынікі апытання НІСЭПД апублікаваныя на сайце арганізацыі і выкарыстаныя для ілюстрацыі электаральных падзей у 2010 г. праз адсутнасць архіўных дадзеных. Па звестках аўтараў, для правядзення даследаванняў стандартна выкарыстоўвалася рэспубліканская квотная выбарка ў памеры 1511 рэспандэнтаў, рэпрэзентатыўная па полу, узросце і рэгіёнах пражывання.

З 2020 г. у Беларусі правядзенне сацыялагічных апытанняў даследчыкамі з-за мяжы істотна абмежаванае. Электаральная сітуацыя ў 2025 г. прадстаўлена на падставе аналізу дадзеных даследавання Chatham House, праведзенага са снежня 2024 па студзень 2025 г. з выкарыстаннем 3 метадаў: анлайн-апытанне CAWI (квотная

выбарка 833 рэспандэнта, адпавядае структуры гарадскога насельніцтва Беларусі старэйшыя за 18 гадоў і скарэкціравана па полу, узросце, памеры горада і ўзроўню адукацыі.; глыбінныя інтэрв'ю з беларусамі розных узростаў і палітычных поглядаў, тэлефоннае апытанне CATI (выпадковая рэспрэзентатыўная выбарка 400 рэспандэнтаў)

Дадзеныя iSANS (2023-2025) — анлайн-апытанні гарадскіх жыхароў ва ўзросце 18-65 гадоў, праведзеныя з выкарыстаннем стандартызаванай анкеты, прызначанай для вымярэння ўспрымання эканамічнай сітуацыі, палітычных поглядаў і сацыяльных чаканняў. Выбарка адпавядае структуры гарадскіх жыхароў Беларусі ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў і скарэкціравана па полу, узросце і рэгіёне пражывання (стандартны аб'ём — 1200-1500 рэспандэнтаў, працэнт адсеву — ±14%). Апытанне праводзілася з выкарыстаннем кампутарнага вэб-інтэрв'ювання (CAWI).

## Абмежаванні даследавання

Аналіз дадзеных даследаванняў, які ахоплівае перыяд з 2001 па 2025 год, сутыкаецца з шэрагам абмежаванняў, абумоўленых тэарэтычнымі, метадалагічнымі і метадычнымі адрозненнямі ў арганізацыі і правядзенні палявых работ. Гэтыя адрозненні могуць уплываць на сумяшчальнасць вынікаў, атрыманых у розныя гады, і патрабуюць асцярожнага падыходу пры інтэрпрэтацыі доўгатэрміновых трэндаў.

У справаздачы прадстаўлены абагульненыя характарыстыкі электаральных і палітычных працэсаў, разгледжаныя праз прызму сацыяльна-дэмаграфічных асаблівасцей рэспандэнтаў. Асаблівая ўвага нададзена дынаміцы палітычных вынікаў у іх часавым кантэксце — гэта дазваляе выявіць не толькі колькасныя змены, але і якасныя зрухі ў перавагах і паводзінах выбаршчыкаў.

На аснове комплекснага аналізу эмпірычных звестак і тэарэтычных абагульненняў распрацавана класіфікацыя этапаў электаральнай дынамікі. Гэтая класіфікацыя адлюстроўвае ключавыя перыяды трансфармацыі палітычнай сітуацыі, выдзеленыя па крытэрыях стабільнасці, крызісаў і пераходных працэсаў. Асноўныя трэнды развіцця палітычнай сітуацыі выяўлены шляхам супастаўлення дадзеных розных гадоў, а таксама з улікам знешніх і ўнутраных фактараў, якія ўплываюць на электаральныя паводзіны.

# САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНЫЯ І ПАЛІТЫЧНЫЯ АЦЭНКІ 2004-2025[3]

## Давер інстытутам

Аналіз паказчыкаў даверу асноўным дзяржаўным інстытутам дае магчымасць сфарміраваць уяўленні аб дынаміцы стаўлення да ўлады ў Беларусі. 2006 год характарызуецца высокімі паказчыкамі даверу да інстытутаў. 2010-ы характарызуецца іх нязначным зніжэннем. Аднавіць давер атрымліваецца напярэдадні выбараў 2015 г., што, верагодна, з'яўляецца наступствам украінскага Майдана і акупацыі Расіяй Крыма. Можна канстатаваць зніжэнне даверу асноўным інстытутам у 2016-2019 гг., што стала адной з падстаў пратэстаў 2020 г. Крызіс легітымнасці назіраецца аж да другой паловы 2022 г., дзе на фоне страху вайны адбываецца рэстаўрацыя даверу.

Важна разумець, гаворачы аб даверы да дзяржаўных інстытутаў у Беларусі, не варта ўспрымаць "давер" у заходнім сэнсе. Беларускі кантэкст даверу — гэта істытуцыянальны страх у спалучэнні з адаптацыяй пры адсутнасці альтэрнатыў. Дзяржава выступае адзінай крыніцай стабільнасці, ва ўмовах ізаляцыі іншых аўтарытэтаў няма, адбываецца выгаранне і прыняццё вертыкалі ўлады як не пазбежнага факта.

Ці давяраеце вы? (каэфіцыент)




3. Для забеспячэння магчымасці параўнання з анлайн-даследаваннямі iSANS з дадзеных ІС НАН (2004-2022) было адабрана гарадское насельніцтва ва ўзросце 18-65 гадоў

# Ацэнкі палітычнай сітуацыі

Ацэнкі палітычнай сітуацыі ў краіне дазваляюць выразна зафіксаваць:

1. Паралелі паміж ацэнкамі палітычнай сітуацыі ў посткрызісным 2011 г. і перадкрызісным 2018 г.
2. Калапс даверу і бяспекі ў 2020 г., калі 79% апытаных паказвалі на напружанасць палітычнай абстаноўцы ў краіне.
3. Істотны рост задаволенасці палітычнай сітуацыяй у краіне ў 2022 годзе, калі фокус крытыкі дзяржаўных іспытутаў і палітычнай сітуацыі ў краіне трансфармаваўся ў страх перад вайной і падзяку за няўдзел у ваенных дзеяннях. Страх стаў асновай стабілізацыі ўнутрыпалітычнай сітуацыі.

Як Вы ацэньваеце палітычную абстаноўку ў краіне? (%)




# Эканамічныя ацэнкі

Эканамічная задаволенасць — адзін з цэнтральных паказчыкаў адабрэння ўлады, аднак у Беларусі ён мае сваю спецыфіку.

Ацэнкі сацыяльна-эканамічнага становішча ў краіне добра фіксуюць шэраг змен:

1. 2006 г. характарызуецца нізкім узроўнем не гатыўных адзнак сацыяльна-эканамічнага становішча, што можа тлумачыць высокі ўзровень даверу дзяржаўным іспытутам.
2. З 2011 па 2018 г. адбывалася павелічэнне не гатыўных ацэнак эканамічнага становішча, а значыць і кансалідацыя лаяльнасці ў 2015 г. адбывалася на не эканамічных падставах.
3. Палітычны крызіс 2020 г. аказаў моцны ўплыў на не задаволенасць эканамічнай сітуацыяй, значна знізіўшы ўзровень эканамічных чаканняў.

4. На фоне нізкіх эканамічных чаканняў з 2022 года адбываўся рост задаволенасці сацыяльна-эканамічным становішчам. Гэта кампенсацыйная ілюзія нармалізацыі ва ўмовах палітычнай бездапаможнасці альбо замяшчэнне палітычных установак матэрыяльным камфортам. Калі эканамічныя паляпшэнні ёсць — расце лаяльнасць, калі фактычных эканамічных паляпшэнняў няма — людзі пачынаюць казаць не шта кшталту: “У нас усё нармальна”, таму што так лягчэй жыць і абязбольваць будучыню. Пагаршэнні прымаюцца як “новая норма”, а адсутнасць крызісу як “паляпшэнне”.

Як Вы ацэньваеце сацыяльна-эканамічнае становішча ў краіне? (%)




На працягу ўсяго прааналізаванага перыяду самаацэнка матэрыяльнага становішча насельніцтва заставалася ў зоне “сярэдняй нармальнасці” — устойлівага ўспрымання свайго статусу як “не кепскага, але і не добрага”. Аднак у 2018 і ў 2020 г. фіксуюцца заўважныя спады: рэспандэнты часцей адзначалі пагаршэнне свайго фінансавага стану, рост трывожнасці і нявызначанасці. Пасля 2022 года назіраецца паступовае паляпшэнне адзнак, але яно не заўсёды карэлюе з аб’ектыўнымі эканамічнымі паказчыкамі.

Самаідэнтыфікацыя насельніцтва ў тэрмінах сацыяльнага статусу застаецца стабільнай: большасць па-ранейшаму адносіць сябе да “сярэдняга класа”. Пры гэтым мяняецца не столькі рэальнае становішча, колькі мова яго апісання. Такая ідэнтычнасць выконвае ахоўную функцыю: называючы сябе “сярэднім класам”, людзі імкнуцца зняць унутраную трывогу, стварыць ілюзію прыналежнасці да ўстойлівай групы. Гэта праява “вывучанай абыякавасці” — адаптацыйнай стратэгіі, якая дазваляе знізіць кагнітыўны дысананс ва ўмовах не стабільнасці.

“Сярэдняя ацэнка” — індыкатар адсутнасці чаканняў. Устойлівыя “сярэднія” ацэнкі эканамічнай сітуацыі не адлюстроўваюць рэальную стабільнасць, а сігналізуюць аб адсутнасці ярка выяўленых чаканняў — як пазітыўных, так і негатыўных.

Пры гэтым дынаміка змен мае свае асаблівасці.

У 2022 годзе рост станоўчых адзнак быў звязаны не столькі з рэальным паляпшэннем, колькі з “нармалізацыяй

прымусу”: насельніцтва адаптавалася да шоку 2020-2022 гадоў і прызвычаілася да новых рэалій. На гэтым фоне нават адсутнасць далейшага пагаршэння ўспрымалася як “стабілізацыя”. Пачынаючы з 2023 года станоўчая дынаміка адзнак становіцца больш устойлівай. Гэта ўжо не проста адаптацыя да крызісу, а паступовае фармаванне адчування эканамічнай стабільнасці: людзі пачынаюць заўважаць не вялікія паляпшэнні, што адлюстроўваецца ў росце аптымізму, хоць яго падставы застаюцца хутчэй псіхалагічнымі, чым эканамічнымі.

Як Вы ацэньваеце матэрыяльнае становішча Вашай сям’і? (%)




Доўгі час (з 2015 г.) прагнозы насельніцтва дэманструюць устойлівы фаталізм, а не гатыўныя адзнакі пераважаюць над пазітыўнымі: нават у 2023 г., калі сітуацыя пачынае выраўноўвацца, а эканамічныя і сацыяльныя паказчыкі паляпшацца. Гэта сведчыць аб глыбока ўкаранёнай структуры інтэрыярызаванай бездапаможнасці — стане, пры якім людзі перастаюць верыць у магчымасць рэальных змен.

Для большасці рэспандэнтаў характэрна перакананне, што бягучы стан спраў застанецца нязменным, не залежна ад знешніх абставін. Гэта можа быць абумоўлена шэрагам фактараў.

- Па-першае, шматгадовыя крызісы і несправўджаныя надзеі прывялі да таго, што насельніцтва прызвычаілася ўспрымаць любыя змены як часовыя ці нязначныя, што звязана з пэўнай стратэгіяй кагнітыўнай адаптацыяй.
- Па-другое, фарміруецца ахоўны механізм: песімістычныя прагнозы дазваляюць знізіць узровень трывогі — калі не чакаць нічога добрага, то і расчараванні будуць менш балючымі.
- Па-трэцяе, адсутнасць глыбіннага даверу да палітычных і эканамічных інстытутаў узмацняе адчуванне, што любыя пазітыўныя зрухі альбо не будуць устойлівымі, альбо не закрануць шырокія пласты грамадства.

Такім чынам, нават пры наяўнасці аб’ектыўных паляпшэнняў, фаталістычныя чаканні застаюцца дамінуючай мадэллю ўспрымання будучыні, што адлюстроўвае не толькі бягучы стан грамадства, але і яго гістарычны досвед.

Як, на Вашую думку, зьменіцца сацыяльна-эканамічная сытуацыя ў Беларусі праз год?/ у бліжэйшыя некалькі гадоў? (%)




## Рэзюме

У 2006 г. высокі ўзровень лаяльнасці дзяржаўным інстытутам быў звязаны чаканнямі працягу эканамічнага росту ў Беларусі. Палітычная сітуацыя часта разглядалася як спакойная:

- На фоне эканамічнага крызісу 2008 г. да выбараў 2010 г. давер у дзяржаўным інстытутам знізіўся, што апасродкавала пратэсты.
- У 2015 годзе, нягледзячы на нізкія эканамічныя паказчыкі, на фоне страху перад “украінскім сцэнарам” і агрэсіяй Расіі беларускім уладам удалося кансалідаваць грамадства вакол існуючай сістэмы.
- Назапашванне пратэстных настрояў да дзейнай улады, а таксама эканамічнай не здаволенасці адбывалася ў 2016-2019 г. Няўдалая “кавідная” палітыка і адкрытае грэбаванне працэдурай “выбараў” інтэнсіфікавала пратэстныя настроі 2020 г.
- Востры крызіс легітымнасці дзейнай улады працягваўся аж да 2022 г. Расійская агрэсія супраць Украіны ў 2022 г. дазволіла замарозіць крызіс і сфарміраваць новую форму адносін паміж уладай і грамадствам. Страх перад магчымасцю вайны, а таксама нізкі ўзровень пасткрызісных чаканняў дазволіў уладам рэстаўраваць давер да дзяржаўных інстытутаў і павысіць намінальную эканамічную задаволенасць.

2020 г. застаецца гістарычным пунктам разрыву. 2025 г. — гэта псіхалагічны рамонт, а не палітычная стабілізацыя. Насельніцтва не радыкалізуецца, а дэперсаналізуецца. Давер да інстытутаў расце на фоне адсутнасці альтэрнатыў, а не з перакананняў. Асабістыя чаканні застаюцца вышэй, чым чаканні адносна краіны, прагматычная арыентацыя — фактар лаяльнасці. Адбываецца палярызацыя паміж тэхнакратычна лаяльнымі і адаптыўнымі, с аднаго боку, з другога — выпаленымі і пазбягаючымі.

# ВЫБАРЫ 2001

## Кантэкст

9 верасня 2001 г. адбыліся прэзідэнцкія выбары — другія пасля прыняцця новай Канстытуцыі 1996 г., якая істотна пашырыла паўнамоцтвы Аляксандра Лукашэнкі.

У выбарах А. Лукашэнка прыняў удзел як дзеючы прэзідэнт. Ён ужо кантраляваў асноўныя медыя, адміністрацыйны апарат і выбарчыя камісіі. Галоўным супернікам Лукашэнкі быў Уладзімір Ганчарык — адзіны кандыдат ад апазіцыі. Ганчарыка падтрымалі Федэрацыя прафсаюзаў, частка дэмакратычных партый і незалежныя медыя. Трэцім кандыдатам стаў Сяргей Гайдукевіч, лідар Ліберальна-дэмакратычнай партыі, які выступаў як сістэмны апанент без рэальна апазіцыйнай пазіцыі.

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала 83,9%. У якасці афіцыйных вынікаў выбараў былі абвешчаны наступныя лічбы[4]:

- за Лукашэнку — 75,7%
- за Ганчарыка — 15,7%
- за Гайдукевіча — 2,5%[5]

Апазіцыя, міжнародныя назіральнікі (АБСЕ, ПАСЕ) і незалежныя арганізацыі прызналі выбары не сумленнымі і несвабоднымі. Яны адзначалі масавыя парушэнні, ціск на назіральнікаў, кантроль за датэрміновым галасаваннем і адсутнасць роўнага доступу да СМІ[6].

## Вынікі даследавання[7]

Характарызуючы агульныя настроі ў гэты перыяд, можна казаць пра даволі высокую ступень палітычнага фаталізму: палова апытаных не верыць, што можа ўплываць на тое, што адбываецца. Песімізм заўважна вышэй у моладзі і людзей сярэдняга ўзросту (25–44 гады) — найбольш сацыяльна актыўнай групы.

Ці залежыць зараз у Беларусі што-небудзь ад асобнага чалавека? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 27,4 | 31,4 | 23,9 | 31,4 | 22,1 | 23,3 | 27,9 | 30,3 | 31,3 |
| Не | 50,3 | 50,5 | 50,1 | 55,4 | 56,5 | 59,4 | 47,6 | 39,3 | 37,4 |
| Не ведаю | 22,4 | 18,1 | 26,0 | 13,2 | 21,4 | 17,3 | 24,5 | 30,3 | 31,3 |

4. "Вынікі выбараў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 9 верасня 2001 г.", ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
5. Падрабязныя раскладкі электаральных дадзеных гл. у Дадатак 1
6. "Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 9 верасня 2001 года: Выніковы даклад", Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека. Місія БНДІПЧ АБСЕ па абмежаваным назіранні за выбарамі. Варшава, 2001. 38 с. – С. 3.
7. Даследаванне 2001 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная рэспубліканская выбарка ў 763 рэспандэнты. Праз даўнасць архіўных дадзеных адсутнічаюць дакладныя звесткі аб структуры выбарачнай сукупнасці

Разам з тым мы назіраем высокую самасправаздачнасць рэспандэнтаў аб ўдзеле ў выбарах — 86% адказалі, што узялі ўдзел у выбарах (найбольш актыўнымі выбаршчыкамі аказаліся людзі старэйшага ўзросту: чым старэйшая група, тым больш яна ўдзельнічае ў выбарах). Гэта супадае з афіцыйнамі звесткамі па яўцы; з іншага боку, супадзенне гэтых лічбаў можа быць абумоўленае сацыяльна пажаданай устаноўкай — не жаданнем прызнацца ў няўдзеле ў выбарах з-за ціску. Больш за тое гэта сведчыць пра вынішэнне палітычнага сэнсу і рытуалізацыю электаральнага працэса — ад галасавання нічога не залежыць, але людзі прымаюць удзел у цыклічна-традыцыйнай імпрэзе.

У асноўным выбаршчыкі ўдзельнічалі ў выбарах у дзень іх правядзення, амаль кожны пяты (18%) — датэрмінова, гэта ў асноўным асобы старэйшага ўзросту.

Ролю выбарчай кампаніі можна назваць параўнальна нізкай, мяркуючы па стабільнасці электаральных арыентацый. Амаль палова (48%) выбаршчыкаў прынялі рашэнне аб удзеле загадзя, толькі кожны пяты — пасля рэгістрацыі кандыдатаў або вывучэння праграм, яшчэ менш — у апошні тыдзень ці ў дзень выбараў. Рашэнне галасаваць задоўга да афіцыйнага пачатку агітацыі цалкам можа быць эфектам мабілізацыі праз дзяржаўныя СМІ і патэрналісцкіх чаканняў.

Калі Вы прынялі рашэнне, што будзеце абавязкова ўдзельнічаць у выбарах? (%)

| | |
|---|---|
| Задоўга да рэгістрацыі кандыдатаў | 48,3 |
| Пасля рэгістрацыі кандыдатаў | 12,8 |
| Калі пазнаёміўся(лася) з праграмамі | 8,5 |
| У апошні тыдзень перад выбарамі | 11,1 |
| У дзень выбараў | 7,5 |
| Няма адказу | 11,8 |

У 2001 годзе каля 45% беларусаў падтрымлівалі тэзісы перадвыбарчай праграмы дзейнага прэзідэнта.

Ці падтрымліваеце Вы курс, выкладзены ў перадвыбарчай праграме Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 45,3 | 42,6 | 47,6 | 24,8 | 37,4 | 44,4 | 43,5 | 58,4 | 72,7 |
| Не | 15,1 | 18,4 | 12,3 | 25,6 | 16,0 | 13,5 | 20,4 | 7,9 | 2,0 |
| Цяжка адказаць | 39,6 | 39,0 | 40,1 | 49,6 | 46,6 | 42,1 | 36,1 | 33,7 | 25,3 |

Тут звяртае на сябе ўвагу шэрая зона — амаль столькі ж рэспандэнтаў не змаглі даць адказ, асабліва сярод моладзі, якая і падтрымку праграме выказвае ў найменшай ступені.

З гэтымі паказчыкамі карэлююць самасправаздачныя дадзеныя падтрымкі Лукашэнкі (45%), якія даюць заўважна меньшы ўзровень у параўнанні з афіцыйнымі звесткамі. Моладзь значна часцей падтрымлівала апазіцыйнага кандыдата, старэйшае пакаленне — дзейнага прэзідэнта. Жанчыны — традыцыйна больш лаяльная да дзейнай улады сацыяльна-дэмаграфічная група.

*Электаральны партрэт прыхільнікаў Лукашэнкі:*
*– гэта хутчэй жанчыны, людзі пераважна больш сталага ўзросту (старэй за 55 год)*

Ці маглі б Вы сказаць, за каго прагаласавалі на выбарах? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Лукашэнка | 45,0 | 40,2 | 49,1 | 23,1 | 42,0 | 49,6 | 36,1 | 52,8 | 75,8 |
| Ганчарык | 11,1 | 12,7 | 9,8 | 21,5 | 10,7 | 8,3 | 13,6 | 7,9 | 2,0 |
| Гайдукевіч | 1,3 | 1,5 | 1,0 | 1,7 | 0,8 | 1,5 | 2,0 | 1,1 | 0,0 |
| Ні за кога | 12,9 | 13,0 | 12,9 | 15,7 | 18,3 | 13,5 | 14,3 | 6,7 | 5,1 |
| Няма адказу | 29,7 | 32,6 | 27,2 | 38,0 | 28,2 | 27,1 | 34,0 | 31,5 | 17,2 |

Такім чынам, улічваючы адсоткі тых, хто не адказаў на пытанні пра свой электаральны выбар, ускосна можна меркаваць, што афіцыйныя вынікі былі завышаны, а апазіцыйны кандыдат мог атрымаць больш высокую долю галасоў.

Высокі рэйтынг Лукашэнкі у 2001 годзе — гэта не столькі вынік яго электаральнай прывабнасці, колькі вытворная ад адсутнасці выбару, адсутнасці іншых дастойных кандыдатаў. Каля паловы выбаршчыкаў у 2001 годзе проста не бачылі альтэрнатывы Лукашэнку (48%); а яго самога як такога лічылі дастойным прадстаўніком беларускага народа толькі 21% беларусаў і беларусак.

Што адыграла вызначальную ролю ў выбары кандыдата ў Прэзідэнты ?(%)

| | TOTAL | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Ён самы дастойны прадстаўнік беларускага народа | 21,0 | 8,3 | 10,7 | 16,5 | 15,0 | 36,0 | 51,5 |
| З трох прэтэндэнтаў ён — найбольш прымальная кандыдатура. | 47,9 | 47,9 | 52,7 | 51,9 | 51,0 | 42,7 | 36,4 |
| Чалавек, за якога я б аддаў свой голас, выбыў з прэзідэнцкай гонкі. | 6,3 | 8,3 | 6,1 | 9,8 | 6,1 | 3,4 | 2,0 |
| Мне было ўсё роўна, я галасаваў наўгад | 3,3 | 5,0 | 3,1 | 3,0 | 6,1 | 1,1 | 0,0 |
| Я ні за кога не прагаласаваў | 6,7 | 8,3 | 9,2 | 6,8 | 7,5 | 5,6 | 1,0 |
| Я не хадзіў на выбары | 5,8 | 7,4 | 8,4 | 5,3 | 4,8 | 3,4 | 5,1 |
| Іншае | 1,9 | 5,0 | 1,5 | 0,8 | 2,0 | 1,1 | 1,0 |
| Няма адказу | 7,1 | 9,9 | 8,4 | 6,0 | 7,5 | 6,7 | 3,0 |

Адсутнасць электаральнай альтэрнатывы часткова вызначаецца і працай медыя, якія асвятляюць прадвыбарчую гонку і прасоўваюць праграмы палітычных гульцоў. Аднак не ў беларускім выпадку, дзе і цэнзура пануе, і медыяпісьменнасць аўдыторыі не высокая. У выніку ў 2001 годзе больш за 40% беларусаў не змаглі ацаніць працу медыя ў перыяд электаральнай кампаніі, амаль 30% не задаволены іх працай. Уплыў прапаганды адбіваецца на старэйшых узроставых групах, сярод якіх узровень лаяльнасці прыкметна — што да медыя, шо да ўлады — вышэйшы.

Як бы вы ацанілі працу беларускага тэлебачання і радыё ў перыяд перадвыбарнай кампаніі? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Станоўча | 29,7 | 27,5 | 31,6 | 19,0 | 20,6 | 24,8 | 27,2 | 40,4 | 55,6 |
| Адмоўна | 27,1 | 31,4 | 23,4 | 34,7 | 38,9 | 29,3 | 31,3 | 16,9 | 2,0 |
| Не ведаю | 40,6 | 38,7 | 42,2 | 43,8 | 38,2 | 44,4 | 37,4 | 41,6 | 38,4 |
| Няма адказу | 2,6 | 2,4 | 2,8 | 2,5 | 2,3 | 1,5 | 4,1 | 1,1 | 4,0 |

Калі казаць пра парушэнні ў час выбарчай кампаніі, то большасць рэспандэнтаў з імі не сутыкнуліся персанальна (пра такія парушэнні казалі толькі 4% рэспандэнтаў).

Апазіцыя заяўляе, што выбары былі не сумленнымі. Ці лічыце Вы такія заявы абгрунтаванымі? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 18,9 | 22,7 | 15,7 | 28,1 | 25,2 | 18,8 | 22,4 | 9,0 | 3,0 |
| Не | 47,1 | 43,2 | 50,4 | 34,7 | 38,2 | 50,4 | 40,8 | 56,2 | 70,7 |
| Цяжка адказаць | 32,2 | 32,3 | 32,1 | 36,4 | 35,1 | 30,1 | 34,7 | 32,6 | 22,2 |
| Няма адказу | 1,8 | 1,8 | 1,8 | 0,8 | 1,5 | 0,8 | 2,0 | 2,2 | 4,0 |

Аднак амаль кожны пяты апытаны падтрымаў меркаванне апазіцыі аб не сумленнасці выбараў — для аўтарытарнага асяроддзя гэта значная доля. Сярод моладзі яна набліжаецца да траціны, у той час як старэйшае пакаленне адмаўляе не сумленнасць выбараў. Гэта заканамерны вынік нізкай палітычнай альтэрнатыўнасці і эфэкту прапаганды.

Палітычная апатыя праяўляе сябе і ва ўспрыманні палітычнай сітуацыі: дзве траціны беларусаў не ўбачылі ніякіх зменаў пасля выбараў, амаль кожны пяты не змог адказаць на пытанне. Пры агульных нязначных паказчыках моладзь часцей заўважала пагаршэнні сітуацыі, старэйшыя ўзросту — паляпшэнні. Гэта тыповы патэрналісцкі кансэнсус: “лепш стабільнасць, чым перамены”. Стабільнасць інтэрпрэтуецца як станоўчая каштоўнасць, што ўзмацняе легітымацыю рэжыму.

# Рэзюме

- Апытанне дэманструе электаральную стабільнасць ва ўмовах аўтарытарнай кансалідацыі: наяўнасць устойлівага ядра падтрымкі Лукашэнкі (каля 40-45%) спалучаецца з пасіўнай лаяльнасцю астатніх.
- Палітычная суб’ектнасць знаходзіцца на нізкім узроўні, палова насельніцтва не верыць у магчымасці асабістага ўплыву.
- Палітычная кампанія праводзіцца ва ўмовах інфармацыйнай няроўнасці пры манаполіі дзяржаўных СМІ, большая частка выбаршчыкаў не знаёмая з праграмамі альтэрнатыўных кандыдатаў.
- Моладзь значна больш крытычная, часцей шукае альтэрнатывы і паварочваецца ў бок дэмакратычных настрояў, аднак яе доля малая і палітычна дэмабілізаваная.
- Пры гэтым у грамадстве прысутнічае прыхаваная апазіцыйнасць: радыкальнае разыходжанне паміж самасправаздачным і афіцыйным галасаваннем дэманструе страх, недавер і верагодныя фальсіфікацыі вынікаў.

# РЭФЕРЭНДУМ 2004

## Кантэкст

Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 года праводзіўся адначасова з парламенцкімі выбарамі. Фактычна гэта быў рэферэндум аб скасаванні канстытуцыйнага абмежавання на два прэзідэнцкія тэрміны, што дазволіла Лукашэнку высоўваць сваю кандыдатуру ў прэзідэнты ў 2006 годзе і далей.

Галоўнае пытанне рэферэндуму было сфармулявана наступным чынам: "Ці дазваляеце Вы першаму Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь Лукашэнку А.Р. удзельнічаць у якасці кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь у выбарах Прэзідэнта і ці прымаеце Вы частку першую артыкула 81 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у наступнай рэдакцыі: "Прэзідэнт абіраецца на пяць гадоў не пасрэдна народам Рэспублікі Беларусь на аснове ўсеагульнага, свабоднага, роўнага і прамога выбарчага права пры тайным галасаванні"?".

Паводле афіцыйных звестак, яўка на рэферэндуме склала 90,3%, а "За" прагаласавалі 79,4% выбаршчыкаў[8].

Рэферэндум праходзіў ва ўмовах жорсткага кантролю над СМІ, падаўлення не залежных арганізацый і адсутнасці доступу апазіцыі да тэлеэфіру. Напярэдадні рэферэндума ўлады актыўна выкарыстоўвалі адміністрацыйны рэсурс, ціск на працаўнікоў бюджэтнай сферы, студэнтаў і ваенных. Апазіцыя (у асобе кааліцыі "Пяць плюс") вяла кампанію "Не!", але сутыкнулася з арыштамі актывістаў і канфіскацыяй накладаў агітацыйных матэрыялаў.

Назіральнікі АБСЕ прызналі электаральны працэс не адпаведным дэмакратычным стандартам[9].

## Вынікі даследавання[10]

Вынікі даследавання дэманструюць даволі высокую самасправаздачную яўку, хоць і крыху ніжэйшую за афіцыйныя дадзеныя (82% супраць 90,3%). Найбольш актыўнымі выбаршчыкамі былі вяскоўцы і старэйшае пакаленне; моладзь (18-24) прыкметна менш прымала ўдзел у галасаванні.

Пры падрыхтоўцы рэферэндума, відавочна, выкарыстоўвася адміністратыўны рэсурс. У прыватнасці, гэта бачна па высокай долі датэрміновага галасавання. У сельскай мясцовасці (таксама на поўдні Беларусі — у Брэсцкай і Гомельскай абласцях)  доля датэрміновага галасавання склала больш за 20%. На практыцы датэрміновае галасаванне з'яўляецца інструментам кіраванага галасавання, калі выбаршчыкі фармальна "давалі справаздачу" аб лаяльнасці.

Ці прымалі Вы ўдзел у галасаванні на Рэферэндуме 17 кастрычніка 2004 года? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, галасаваў(ла) у дзень Рэферэндуму | 66,0 | 63,1 | 68,4 | 52,4 | 64,0 | 57,3 | 72,1 | 70,2 | 78,3 |
| Так, галасаваў(ла) датэрмінова | 16,4 | 15,4 | 17,2 | 17,4 | 10,9 | 19,2 | 14,5 | 20,6 | 17,2 |
| Не, не прымаў(ла) удзелу | 12,7 | 15,3 | 10,5 | 25,1 | 16,6 | 16,1 | 9,1 | 8,4 | 2,0 |
| Не хачу адказваць | 5,0 | 6,3 | 3,9 | 5,1 | 8,4 | 7,5 | 4,3 | 0,8 | 2,5 |

8. "Республиканский референдум 17 октября 2004 года", ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
9. "Парламентские выборы 17 октября 2004 года: Итоговый отчет Миссии БДИПЧ/ОБСЕ по наблюдению за выборами", Бюро по демократическим институтам и правам человека Республика Беларусь. – Варшава, 2004. – 31 с. – С. 2.
10. Даследаванне 2004 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная нацыянальная квотная выбарка 1901 рэспандэнт

Апазіцыя заяўляе, што выбары былі не сумленнымі. Ці лічыце Вы такія заявы абгрунтаванымі? (%)

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, галасаваў(ла) у дзень Рэферэндуму | 66,0 | 64,2 | 68,7 | 61,4 | 68,9 | 61,0 | 65,6 | 75,1 | 65,4 | 67,1 |
| Так, галасаваў(ла) датэрмінова | 16,4 | 22,1 | 18,2 | 23,7 | 18,7 | 9,3 | 15,1 | 7,6 | 12,9 | 24,3 |
| Не, не прымаў(ла) удзелу | 12,7 | 10,2 | 7,6 | 11,2 | 5,7 | 21,8 | 14,7 | 14,5 | 15,3 | 6,8 |
| Не хачу адказваць | 5,0 | 3,5 | 5,5 | 3,7 | 6,8 | 7,9 | 4,6 | 2,9 | 6,4 | 1,8 |

Уласныя ацэнкі рэспандэнтаў адносна вынікаў галасавання моцна разыходзяцца з афіцыйнымі дадзенымі. Згодна з афіцыйнымі звесткамі, “За” было 79,4%, па выніках апытання — толькі 56,9%. Пры гэтым доля адмоваў ад адказу склала амаль траціну рэспандэнтаў (29,1%). Тут бачным становіцца эфект самацэнзуры і палітычнага страху, калі людзі пазбягаюць прамога прызнання сваёй нязгоды з пазіцыямі ўлады.

# ВЫБАРЫ 2006

## Кантэкст

19 сакавіка 2006 года адбыліся чарговыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэтыя выбары праходзілі пасля канстытуцыйнага рэферэндуму 2004 года, які адмяніў абмежаванне на два прэзідэнцкія тэрміны і дазволіў Лукашэнку балатавацца зноў

Асноўнымі кандыдатамі былі: Аляксандр Лукашэнка — дзеючы кіраўнік краіны з 1994 года, Аляксандр Мілінкевіч — адзіны кандыдат ад дэмакратычнай апазіцыі, падтрыманы кааліцыяй “За свабоду”, Аляксандр Казулін — былы рэктар БДУ, умерана апазіцыйны кандыдат, Сяргей Гайдукевіч — прадстаўнік сістэмнай “лаяльнай” апазіцыі.

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала 92,6%. У якасці афіцыйных вынікаў выбараў былі абвешчаны наступныя лічбы[11]:

- за Лукашэнку — 83,0%
- за Мілінкевіча — 6,1%
- за Гайдукевіча — 3,5%
- за Казуліна — 2,2%

Уся кампанія праходзіла пад кантролем дзяржавы: апазіцыі не давалі эфірнага часу, а Мілінкевічу перашкаджалі ў правядзенні мітынгаў. Пасля выбараў на Кастрычніцкай плошчы ў Мінску пачаліся шматтысячныя пратэсты, названыя “Плошчай”, якія былі разагнаныя, а многія актывісты арыштаваныя. АБСЕ прызнала выбары не адпаведнымі міжнародным стандартам[12].

## Вынікі даследавання[13]

Па пытанню ўдзела ў выбарах дадзеныя апытання супадаюць з афіцыйнымі звесткамі — аб сваім удзеле у прэзідэнцкіх выбырах заявілі 92% апытаных. Адзначым, што долі выбаршчыкаў былі тым вышэй, чым яны былі старэй: сярод моладзі не галасавалі 16%, сярод людзей ва ўзросце 65 гадоў і болей — 3%.

Амаль траціна (32%) рэспандэнтаў удзельнічала ў датэрміновым галасаванні, што з’яўляецца высокім паказчыкам. Датэрміноваму галасаванню аддавалі перавагу хутчэй жанчыны, людзі ва ўзросце 55 гадоў і старэй, вяскоўцы і жыхары Гомельскай вобрасці.

Менавіта датэрміновае галасаванне ў 2006 годзе стала галоўнай крыніцай абвінавачванняў у масавых фальсіфікацыях.

11. “Сообщение об итогах выборов Президента Республики Беларусь”, ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
12. “Промежуточный отчет № 1 8-24 февраля 2006 г.”, Бюро по демократическим институтам и правам человека ОБСЕ Миссия по наблюдению за выборами Президентские выборы Беларусь, 2006 год. – 2006. – 8 с.
13. Даследаванне 2006 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная нацыянальная квотная выбарка 2348 рэспандэнтаў

У сакавіку адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ці прымалі Вы ў іх удзел? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) датэрмінова (14-18 сакавіка) | 32,4 | 28,5 | 35,7 | 26,4 | 29,4 | 29,9 | 34,4 | 38,5 | 37,3 |
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) у дзень выбараў 19 сакавіка | 59,5 | 62,6 | 57,0 | 58,0 | 60,0 | 63,3 | 58,6 | 56,0 | 59,5 |
| Не, не прымаў(ла) удзелу | 8,0 | 8,9 | 7,3 | 15,6 | 10,5 | 6,8 | 7,0 | 5,5 | 3,3 |

Самасправаздачныя дадзеныя пра вынікі галасавання традыцыйна разыходзяцца з афіцыйнымі: падтрымку дзеючаму прэзідэнту выказалі 62,6% (афіцыйная лічба — 83,0%).

Кандыдатуру Мілінкевіча больш за іншых падтрымалі моладзь (11%) і мінчане (14%).

*Электаральны партрэт прыхільнікаў Лукашэнкі:*
*– традыцыйна, гэта хутчэй жанчыны, людзі пераважна больш сталага ўзросту (асабліва старэй за 55 год), вяскоўцы і жыхары Гродненскай, Віцебскай і Магілёўскай абласцей.*

Ці маглі б Вы адказаць, як Вы прагаласавалі? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| За Гайдукевіча С. | 1,1 | 1,1 | 1,0 | 0,8 | 1,9 | 1,2 | 0,8 | 1,2 | 0,6 |
| За Казуліна А. | 0,8 | 1,3 | 0,5 | 0,7 | 1,6 | 0,9 | 1,1 | 0,3 | 0,0 |
| За Лукашенка А. | 62,6 | 55,9 | 68,0 | 42,5 | 50,5 | 59,3 | 61,1 | 75,9 | 87,9 |
| За Мілінкевіча А. | 6,0 | 8,0 | 4,4 | 10,8 | 6,8 | 6,3 | 6,2 | 3,9 | 2,2 |
| Супраць усіх | 3,4 | 3,8 | 3,0 | 5,7 | 4,3 | 3,6 | 4,1 | 1,8 | 0,4 |
| Не хочу адказваць | 26,1 | 29,8 | 23,1 | 39,6 | 34,9 | 28,6 | 26,6 | 16,8 | 8,9 |

Акрамя заяўленых лічбаў аб сваім электаральным выбары, тут варта звярнуць увагу на ўзмацненне страху і схаваную апазіцыйнасць: кожны пяты рэспандэнт (а моладзь асабліва) адмовіліся ад адказу на пытанне, што сведчыць пра недавер да сістэмы і адаптацыю да аўтарытарных умоваў.

Тэзіс пра недавер да сістэмы падцведжваецца наступным фактам: толькі 50% апытаных давяраюць вынікам выбараў. Для афіцыйнай лічбы з 83% прагаласаваўшых за Лукашэнку — гэта вельмі нізкі ўзровень легітымацыі. Рэгіёны — Магілеўская і Гомельская вобласці, а таксама сельская мясцовасць — больш схільныя да даверу, Мінск і моладзь — менш.

А як Вам здаецца, у якой меры можна давяраць вынікам праведзеных прэзідэнцкіх выбараў? (%)

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Думаю, што вынікі выбараў дакладныя, ім можна давяраць | 51,3 | 56,5 | 54,3 | 62,9 | 42,5 | 32,6 | 46,5 | 67,6 | 46,5 | 61,7 |
| Нейкія парушэнні | 24,7 | 28,4 | 23,3 | 20,7 | 36,9 | 25,3 | 22,7 | 16,7 | 25,7 | 22,4 |
| Істотныя парушэнні | 11,4 | 6,1 | 5,6 | 7,3 | 10,8 | 26,2 | 14,8 | 4,8 | 13,0 | 7,8 |
| Цяжка адказаць | 12,7 | 8,9 | 16,8 | 9,1 | 9,9 | 15,9 | 16,0 | 10,9 | 14,7 | 8,2 |

## Рэзюме

- Узмацненне аўтарытарнай стабільнасці прывяло да таго, што 2006 год стаў кульмінацыяй інстытуцыяналізацыі асабістай улады Лукашэнкі: пасля зняцця абмежаванняў на тэрміны кіравання краінай і разгрому апазіцыі палітычная сістэма Беларусі канчаткова аформілася як не канкурэнтная.

- Ключавым паказчыкам адміністрацыйнага кантролю з'яўляецца масавае датэрміновае галасаванне. Траціна рэспандэнтаў галасавала загадзя, часта пад ціскам працадаўцаў, што стварыла магчымасці для маніпуляцый і чым тлумачыцца разыходжанне паміж самасправаздачнымі і афіцыйнымі вынікамі.

- Адбываецца раздваенне грамадскай свядомасці: пры тым, што большасць дэманструе знешнюю лаяльнасць і жаданне дыстанцыявацца ад палітыкі (дэкларацыя даверу, гатоўнасць падтрымліваць уладу), значная частка альбо ўхіляецца ад адказаў на прамыя пытанні, альбо выказвае сумненні.

- Гэта правакуе рэгіянальныя і ўзроставыя адрозненні: моладзь і жыхары Мінска становяцца цэнтрамі ўмеранай апазіцыйнасці, старэйшыя ўзросты і правінцыйныя рэгіёны ператвараюцца ў апору рэжыму. Гэта раскол, які стане ўстойлівым патэрнам беларускай палітыкі на дзесяцігоддзі.

- 2006 год можна назваць сімвалічным пераходам да "пост-альтэрнатыўнай" палітыкі: пасля выбараў фактычна знікла інстытуцыяналізаваная апазіцыя, яе лідары былі маргіналізаваны або рэпрэсаваны, а палітычнае жыццё зведзена да імітацыі палітычнага ўдзелу.

- Электаральнае даследаванне 2006 года дэманструе высокі ўзровень знешняй мабілізацыі пры нізкай шчырасці уцягнутасці, відавочны эфект страху і самацэнзуры ў адказах, разрыў паміж афіцыйнай і рэальнай падтрымкай улады. Гэта дэманструе пачатак палітычнага застою, які панаваў над беларускім грамадствам да падзей 2020 года.

# ВЫБАРЫ 2010

## Кантэкст

На прэзідэнцкіх выбарах 2010 года ўпершыню з`яўляецца шырокі спектр альтэрнатыўных кандыдатаў. Іх кампаніі стварылі эфект навізны, павысілі цікавасць да палітыкі і сфарміравалі чаканне сапраўднай палітычнай канкурэнцыі. Наяўнасць не залежных медыя і распаўсюджванне электронных СМІ павысілі інфарматыўную насычанасць электаральнага працэсу, магчымасць прагляду тэледэбатаў стварылі эфект перадвыбарчай барацьбы (тэледэбаты глядзелі две траціны насельніцтва).

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала — 90,65 %. У якасці афіцыйных вынікаў выбараў былі абвешчаны наступныя лічбы.

- за Лукашэнку — 79,7%
- за Саннікава — 2,4%
- за Костусева — 2,0%,
- за Раманчука — 2,0%
- за Някляева — 1,8%
- за Цярэшчанка — 1,2%
- за Статкевіча — 1,1%
- за Рымашэўскага — 1,1%
- за Міхалевіча — 1,0%
- за Усса — 0,4%

Аб'яўленне вынікаў выклікала шматтысячныя пратэсты, якія былі жорстка разагнаныя, а супраць апазіцыйных палітычных лідараў былі ўзбуджэны крымінальныя справы.

Арганізацыя па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе (АБСЕ) не прызнала выбары Прэзідэнта Беларусі легітымнымі.

## Вынікі даследавання[16]

Па дадзеных апытання, на 2010 год грамадства палярызавана паміж устаноўкамі на стабільнасці (49,7%) і імкненнямі да змен (41,2%).

Пры гэтым фаталізму ў грамадстве яшчэ няма. Грамадства адчувае, што змены магчымыя і ёсць канкурэнцыя сэнсаў. Разам з тым, у грамадстве адчуваецца стомленасць ад аднастайных выбарчых кампаній, на настроях адбіваецца і адсутнасць яскравага апазіцыйнага кандыдата. Аднак гэта не адбіваецца на высокім структурным, а не сітуатыўным галасаванні: практычна кожны другі рэспандэнт ужо загадзя ведаў, як прагаласуе. Назіраецца вельмі нізкі ўзровень прызнання ціску – амаль 90%. Толькі кожны пяты прагаласаваў датэрмінова, і толькі 3,2% з іх зрабілі гэта пад ціскам. Сістэма выглядае мяккай, прымус не адчуваецца як гвалт.

Самасправаздачныя дадзеныя аб выніках выбараў традыцыйна моцна меншыя за афіцыйныя: дзейны прэзідэнт набірае толькі 51,1% (тобок перавага ёсць, але яна не вялікая).

14. "ИТОГОВЫЕ СВЕДЕНИЯ о результатах голосования по выборам Президента Республики Беларусь", ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
15. "ОБСЕ не признала выборы Президента Беларуси", Бюро по демократическим институтам и правам человека ОБСЕ Миссия по наблюдению за выборами Президентские выборы Беларусь, 5 лістапада 2025
16. "Исследование 20010 г. НИСЭПИ, республиканская квотная выборка 1511 респондентов", НИСЭПИ, 5 лістапада 2025

За каго вы прагаласавалі на прэзідэнцкіх выбарах 19 снежня? (%)

| | |
|---|---|
| За А. Лукашенка | 51,1 |
| За У. Някляева | 8,3 |
| За А. Санникова | 6,1 |
| За В. Рымашэўскага | 3,7 |
| За Я. Раманчука | 3,2 |
| За А. Михалевіча | 2,7 |
| За М. Статкевича | 1,7 |
| За Г. Костусева | 1,6 |
| За В. Цярэшчанка | 0,6 |
| За Д. Усса | 0,5 |
| Супраць усіх | 5,1 |
| Не захацеў адказваць на гэтае пытанне | 3,8 |
| Не ўдзельнічалі ў галасаванні | 11,6 |

Сумарна альтэрнатыўныя кандыдаты набіраюць 28,4%, г.зн. прысутнічае нарастаючая маса незадаволеных. Гэта найбольш канкурэнтныя выбары ў гісторыі рэжыму пасля 2001 года.

Скептыцызм у дачыненні да выбараў высокі: 29,4% лічаць іх сфальсіфікаванымі, яшчэ вышэй доля тых, хто не лічыць іх свабоднымі і роўнымі.

Давер выбарам (%)

| | ТАК | НЕ | ЦЯЖКА АДКАЗАЦЬ |
|---|---|---|---|
| Як Вы лічыце, ці былі выбары прэзідэнта Беларусі 19 снежня 2010 г. свабоднымі і справядлівымі? | 54.4 | 32.3 | 13.3 |
| Ці былі, на Вашу думку, падчас выбараў роўныя ўмовы ва ўсіх кандыдатаў? | 48.6 | 39.9 | 11.5 |

## Рэзюме

- Палітычны кантэкст 2010 г. у Беларусі характарызуецца посткрызісным аптымізмам і адноснай эканамічнай стабільнасцю: краіна выходзіць з сусветнага крызісу лягчэй, чым многія, улада актыўна выкарыстоўвае сацыяльныя выплаты, павышэнне заробкаў, працуе “сацыяльны кантракт”. Гэта крыху падвышала давер да рэжыма.
- 2010 г. адносна пераломны ў гісторыі Беларусі, пасля якога знікае вера ў выбары як інструмент, а гвалт 19 снежня разбурае ілюзію “мяккага аўтарытарызму”. Пачынаецца масавая дэпалітызацыя, а пасля “маўклівых пратэстаў” і крызісу 2011-2012 людзі сыходзяць у выжыванне.

- Рэжым становіцца больш жорсткім: аказвае ціск на партыі, закрывае НДА, ставіць пад кантроль універсітэты. Грамадства замыкаецца ў сабе, фармуецца дэмаркацыйная лінія паміж лаяльнымі прыхільнікамі рэжыму і тымі, хто схільны да прагматычнай рэзігнацыі: палітыка не бяспечная — мы ў яе не лезем.

- Гэта апошні момант у гісторыі Беларусі, калі выбары заставаліся хаця б у нейкай ступені палітычным полем канкурэнцыі. Канец мадэлі палярызаванага аўтарытарызму прыводзіць да мадэлі “застылага грамадства”: пратэст разбураны, палітычная канкурэнцыя знішчана, пачынаецца эпоха кіраваных рытуалаў.

# ВЫБАРЫ 2015

## Кантэкст

11 кастрычніка 2015 года — першыя буйныя выбары пасля крызісу ва Украіне (2014) і ўзмацнення рэгіянальнай не стабільнасці: у грамадстве было моцнае імкненне да "стабільнасці і бяспекі". Ціск у эканоміцы, выкліканы наступствамі сусветнага крызісу і падзення цэн на энергарэсурсы, прывёў да чаканняў пагаршэння даходаў разам са страхам не стабільнасці. Дзяржаўная медыяпрастора захоўвала манаполію (тэлебачанне па-ранейшаму дамінуе), доступ апазіцыі да эфірнага часу быў абмежаваны.

Асноўнымі кандыдатамі на тых выбарах былі: Аляксандр Лукашэнка — дзеючы кіраўнік дзяржавы, Таццяна Караткевіч — актывістка кампаніі "Гавары праўду!", Сяргей Гайдукевіч — старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі, Мікалай Улаховіч — вярхоўны атаман РГА "Беларускае казацтва".

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала 87,2%. У якасці афіцыйных вынікаў выбараў былі абвешчаны наступныя лічбы[17]:

- за Лукашэнка — 83,5%
- за Караткевіч — 4,4%
- за Гайдукевіча — 3,2%
- за Улаховіча — 1,7%

Місія АБСЕ адзначыла прыкметныя парушэнні як дзеючага заканадаўства, так і выбарчага працэсу, а таксама абмежаваны доступ выбаршчыкаў да праграм кандыдатаў і да інфармацыі пра выбары[18].

## Вынікі даследавання[19]

Апытанне грамадскай думкі ў 2015 годзе дэманструе ўстойлівую, але часткова схаваную дамінацыю праражымных настрояў: большасць рэспандэнтаў ацэньвалі дзейнасць прэзідэнта станоўча (станоўча ці хутчэй станоўча — 61%). Тым не менш кожны пяты выказаў не гатыўныя ацэнкі, і амаль столькім жа было цяжка адказаць на гэтае пытанне (18%).

Адносна пазітыўнымі выглядаюць і ацэнкі паспяховасці дзейнасці дзеючай улады. На пытанне аб тым, чаго больш у дзейнасці прэзідэнта, дасягненняў ці няўдач, 42% сказалі, што дасягненняў. Пра няўдачы казалі толькі 5%, а што тых і другіх прыкладна пароўну — 34%. Яшчэ 19% не адказалі на гэтае пытанне.

У 2015 годзе большасць рэспандэнтаў сапраўды ўхвалялі абраны ўладай курс. Нават сярод моладзі не гатыўныя ацэнкі не перавысілі 25%, а ў не каторых рэгіёнах агульныя станоўчыя ацэнкі дасягалі больш за 70%. Самыя крытычныя настроі дэманстраваліся ў Віцебскай вобласці і ў сталіцы.

Усё гэта сведчыць пра перавагу пазітыўнай ацэнкі поспехаў улады пры прыкметнай долі нявызначаных і ўмерана крытычных адказаў. Насельніцтва схільна прызнаваць дасягненні рэжыму (асабліва ў пытаннях парадку і бяспекі). Разам з тым значная "шэрая зона" паказвае, што падтрымка не з'яўляецца безумоўнай — яна часта прагматычная: стабільнасць важнейшая за перамены.

17. "Белорусский ЦИК подвел окончательные итоги президентских выборов", INTERFAX.RU, 5 лістапада 2025
18. "Выборы Президента 11 октября 2015 года. Итоговый отчет Миссии по наблюдению за выборами ОБСЕ/БДИПЧ", Бюро по демократическим институтам и правам человека. – Варшава, 2016. – 43 с.
19. Даследаванне 2015 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная нацыянальная квотная выбарка 1706 рэспандэнтаў

Наколькі Вы згодны са сцвярджэннем пра тое, што пад кіраўніцтвам цяперашняга Кіраўніка дзяржавы Беларусь у цэлым развіваецца ў правільным кірунку? (%)

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Цалкам згодзен(а) | 25,3 | 44,6 | 4,0 | 44,4 | 22,5 | 10,2 | 32,9 | 17,9 | 21,5 | 36,4 |
| Хутчэй згодзен(а) | 41,1 | 38,3 | 33,3 | 37,0 | 44,8 | 46,7 | 43,4 | 43,0 | 42,3 | 37,5 |
| Хутчэй не згодзен(а) | 14,6 | 9,0 | 38,6 | 7,3 | 5,6 | 18,1 | 11,7 | 10,9 | 16,1 | 10,4 |
| Не згодны(а) | 3,5 | 1,2 | 3,9 | 2,5 | 4,3 | 6,3 | 3,1 | 2,5 | 3,6 | 3,1 |
| Цяжка адказаць | 15,5 | 7,0 | 20,2 | 8,8 | 22,8 | 18,7 | 9,0 | 25,7 | 16,5 | 12,6 |

Больш за 95% усіх катэгорый насельніцтва ведалі пра будучыя выбары. Гатоўнасць да ўдзелу ў выбарах выказвалі каля 80% выбаршчыкаў. Найбольшыя сумневы адносна пэрспэктываў свайго ўдзелу выказала моладзь, але ў цэлым дадзеныя апытання карэлююць з афіцыйнымі звесткамі аб высокай яўкцы.

Каля паловы рэспандэнтаў планавалі браць удзел у выбарах у дзень галасавання, каля 40% занялі нявызначаную пазіцыю. Гатоўнасць да ўдзелу ў датэрміновым галасаванні выказалі 8,8%. Адзначым, датэрміновае галасаванне ўвогуле добра ўспрымалася беларусамі: станоўча ці хутчэй станоўча да яго ставіліся 49% беларусаў.

Гэта азначае, што інстытуцыянальная практыка датэрміновага галасавання ў 2015 годзе ўспрымалася ў прыкметнай часткі грамадства як дапушчальная і зручная. У электаральнай архітэктуры рэжыму датэрміновае галасаванне — зручны механізм для адміністрацыйнай мабілізацыі. Пазітыўнае стаўленне да яго палягчае яго выкарыстанне на практыцы.

У якасці асноўнай матывацыі ўдзелу ў выбарах людзі адзначалі “грамадзянскі абавязак” (больш за 50%) і жаданне выказаць сваё меркаванне (27%). Прыкметнымі з’яўляюцца і долі тых, хто не бачыць асаблівага сэнсу ў выбарах, але плануе браць у іх ўдзел (19%), а таксама тых, хто адмовіўся ад адказу (19%).

Ключавой праблемай выбараў у Беларусі часта становіцца пытанне асвятлення прэзідэнцкай кампаніі. Нягледзячы на высокі дэклараваны ўзровень выбарчай актыўнасці, кожны трэці рэспандэнт адзначыў адсутнасць цікавасці да перадвыбарчай кампаніі і толькі кожны чацвёрты спецыяльна цікавіцца гэтай тэмай. У асноўным спажыванне электаральнай інфармацыі выпадковае і сітуатыўнае.

Відавочны дамінант у інфармацыйных рэсурсах — тэлебачанне, на другім месцы Інтэрнэт і друкаваныя СМІ.

Тут добра заўважным становіцца разрыў у стратэгіях медыяспажывання моладзі і старэйшых узроставых груп. Для апошніх дамінантам было і ёсць тэлебачанне, а для моладзі прыярытэтнай крыніцай інфармацыі становіцца Інтэрнэт.

Якім інфармацыйным крыніцам аб маючых адбыцца выбарах Вы аддаеце перавагу? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тэлебачанне | 72,8 | 69,8 | 75,3 | 48,5 | 63,0 | 76,2 | 75,2 | 84,7 | 89,9 |
| Інтэрнэт | 28,0 | 29,3 | 27,0 | 50,3 | 44,7 | 32,2 | 24,2 | 10,1 | 3,8 |

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Друкаваныя СМІ (газеты, часопісы) | 27,1 | 27,0 | 27,2 | 13,2 | 19,4 | 23,8 | 33,8 | 38,2 | 35,2 |
| Рэклама, наглядная агітацыя | 21,2 | 21,8 | 20,6 | 28,8 | 20,8 | 20,0 | 23,4 | 21,7 | 12,5 |
| Гутаркі з калегамі па працы, сябрамі, знаёмымі, сваякамі | 12,1 | 11,5 | 12,7 | 11,3 | 14,2 | 13,0 | 13,4 | 10,7 | 9,4 |
| Радыё | 18,3 | 18,8 | 17,9 | 7,9 | 12,9 | 13,5 | 18,4 | 22,2 | 36,8 |
| Іншае | 0,7 | 0,9 | 0,5 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 2,5 | 0,2 |
| Не атрымліваю інфармацыі | 3,0 | 2,6 | 3,3 | 4,4 | 4,4 | 3,0 | 2,7 | 1,4 | 1,9 |

Інтэрнэт дае кропку апоры для альтэрнатыўных меркаванняў, асабліва сярод гарадскога і маладога электарату.

Ключавой задачай перадэлектаральнага даследавання 2015 года было прагназаванне вынікаў прэзідэнцкай кампаніі. Тут важна, што самасправаздачныя намеры галасаваць “за” Лукашэнку прыкметна ніжэйшыя за афіцыйны вынік (45% супраць афіцыйных 83%), а высокі працэнт “шэрай зоны” (не хачу абказваць і цяжка адказаць) паказвае значную самацэнзуру рэсандэнтаў і іх ўтоеную нявызначанасць.

Калі б заўтра адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, за каго б Вы прагаласавалі? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,7 | 1,2 | 0,3 | 1,6 | 0,5 | 0,8 | 1,2 | 0,2 | 0,0 |
| С. Калякін | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Т. Караткевіч | 0,9 | 0,8 | 1,0 | 1,7 | 0,8 | 0,6 | 0,9 | 1,2 | 0,3 |
| А. Лябедзька | 0,3 | 0,5 | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 1,0 | 0,0 | 0,3 | 0,5 |
| А. Лукашэнка | 45,4 | 38,0 | 51,7 | 34,5 | 33,6 | 40,7 | 46,5 | 48,9 | 71,5 |
| Ж. Раманоўская | 0,8 | 1,0 | 0,7 | 0,7 | 1,2 | 0,9 | 0,7 | 1,3 | 0,2 |
| В. Цярэшчанка | 0,3 | 0,4 | 0,1 | 0,4 | 0,6 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,3 |
| М. Улаховіч | 0,0 | 0,0 | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Цяжка адказаць | 33,0 | 37,8 | 28,9 | 41,7 | 39,5 | 39,0 | 32,3 | 24,5 | 19,0 |
| Не хацеў бы адказваць на гэтае пытанне | 18,5 | 20,2 | 17,1 | 18,9 | 23,8 | 16,9 | 18,1 | 23,6 | 8,1 |

Ключавы парадокс даследавання ў тым, што самасправаздачная падтрымка Лукашэнкі (45%) прыкметна ніжэйшая за чаканы/афіцыйны вынік (83%).

Пры гэтым пераважная большасць (83%) перакананая, што менавіта Лукашэнка і пераможа.

*Электаральны партрэт прыхільнікаў Лукашэнкі:*
*– традыцыйна, гэта хутчэй жанчыны, людзі пераважна больш сталага ўзросту (старэй гадоў за 45, а асабліва — старэй за 65), вяскоўцы і жыхары Брэсцкай і Мінскай абласцей.*

Як Вы думаеце, хто будзе абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на будучых выбарах? (%)

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,3 | 1,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,8 | 0,0 | 1,0 |
| С. Калякін | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,1 |
| Т. Караткевіч | 0,4 | 2,1 | 0,4 | 0,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,4 | 0,6 |
| А. Лябедзька | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| А. Лукашэнка | 82,8 | 87,9 | 87,3 | 71,3 | 97,9 | 83,0 | 82,1 | 72,4 | 84,0 | 79,5 |
| Ж. Раманоўская | 0,2 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,0 |
| В. Цярэшчанка | 0,7 | 0,3 | 0,0 | 4,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,1 | 2,5 |
| М. Улаховіч | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,6 | 0,0 | 0,0 | 0,3 |
| Цяжка адказаць | 15,4 | 8,2 | 11,5 | 24,3 | 2,1 | 16,3 | 17,3 | 26,5 | 15,3 | 15,9 |

Гэтае спалучэнне адлюстроўвае адразу не калькі феноменаў:

- сацыяльная пажаданасць / страх — частка рэспандэнтаў аддае перавагу не раскрываць рэальную пазіцыю;
- маніпуляваная выбарчая серада — адміністраваная яўка, датэрміновае галасаванне і магчымыя фальсіфікацыі тлумачаць разыходжанне;
- рэальнае, але частковае ядро падтрымкі — каля 40–50% шчырай падтрымкі і значная “ціхая” маса, якая можа быць мабілізавана адміністрацыйна.

Узровень даверу да патэнцыйных вынікаў выбараў у 2015 годзе быў умераным, але будучым звесткам гатовыя былі паверыць больш за палову рэспандэнтаў — каля 60%. Тут зноў звяртае на сябе ўвагу “шэрая зона”: кожнаму пятаму было цяжка адказаць на пытанне аб тым, ці можна будзе давяраць дадзеным будучых выбараў (у асобных рэгіёнах іх доля набліжаецца да 30%).

У адказах на пытанне аб праве альтэрнатыўных кандыятаў аспрэчваць вынікі выбараў паказальна, што доля выбаршчыкаў, якія давяраюць прававым сродкам абароны альтэрнатыўных кандыдатаў, супадае з колькасцю прыхільнікаў дзеючай улады. І нягледзячы на нізкі ўзровень пратэстных настрояў, кожны чацвёрты не бачыў сэнсу спрабаваць паўплываць на вынік выбараў.

Як Вы лічыце, ці маюць права кандыдаты, якія прайгралі, аспрэчваць вынікі выбараў у выпадку нязгоды з імі? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, але толькі ў парадку, вызначаным заканадаўствам | 45,9 | 45,7 | 46,0 | 37,3 | 50,6 | 50,0 | 50,8 | 48,0 | 36,0 |
| Так, у тым ліку на масавых акцыях, аж да перагляду вынік | 3,1 | 4,0 | 2,4 | 5,1 | 3,0 | 2,8 | 3,7 | 3,0 | 1,4 |
| Не, гэта не мае сэнсу | 24,1 | 25,9 | 22,6 | 30,2 | 26,0 | 22,5 | 21,1 | 20,3 | 24,9 |
| Не, гэта парушае парадак у краіне | 12,3 | 12,3 | 12,2 | 10,7 | 10,5 | 12,0 | 12,3 | 14,0 | 14,5 |
| Іншае | 0,8 | 0,7 | 0,9 | 0,5 | 0,7 | 0,0 | 0,4 | 2,3 | 0,7 |
| Цяжка адказаць | 13,8 | 11,4 | 15,9 | 16,4 | 9,1 | 12,7 | 11,7 | 12,3 | 22,5 |

Давер становіцца інструментальным — людзі гатовыя прызнаць вынікі, нават калі падазраюць парушэнні.

Яшчэ адзін момант, на які варта звярнуць увагу, — гэта пытанне “Калі Ваша жыццё пагаршаецца — хто вінаваты?”.

Самая частая прычына, названая рэспандэнтамі, — сусветны фінансавы крызіс (48,7%), далей — урад (36,9%), на трэцім месцы варыянт “вінаватыя мы самі (насельніцтва)” (21,6 %), затым — прэзідэнт (18,8%) і мясцовая ўлада (17,2%). Эканамічныя праблемы ў 2015 годзе ў асноўным інтэрпрэтаваліся як знешнія (крызіс), што палягчала рэжыму зняццё адказнасці з сябе. Гэта зніжала палітычны ціск на цэнтральную ўладу (частка электарату гатовая тлумачыць падзенне ўзроўню жыцця знешнімі прычынамі).

Больш сталыя групы насельніцтва (старэйшыя за 55 гадоў) дэманструюць больш высокі ўзровень падтрымкі і даверу да ўлады; моладзь (18–34) — больш крытычная, часцей сыходзіць у “шэрую зону”. У сельскай мясцовасці назіраецца больш высокая падтрымка асобы ўлады і інстытуцыянальная гатоўнасць (напрыклад, да датэрміновага галасавання), у гарадах вышэйшая доля сумненняў і апазіцыйна настроеных выбаршчыкаў.

## Рэзюме

- Як і ў папярэдніх цыклах, падтрымка ўлады мацнейшая ў шэрагу абласцей (напрыклад, Брэсцкая, Гомельская, Мінская вобласці выяўляюць больш высокі пазітыў), тады як Мінск і некаторыя рэгіёны (Віцебская, Магілёўская вобласць) маюць большую долю тых, хто сумняеецца і настроены супраць.
- 2015 год дэманструе той жа двупалярны шаблон, які мы назіралі ў 2001–2006: сельская мясцовасць / старэйшае пакаленне / работнікі бюджэтнай сферы супраць гарадскога насельніцтва / моладзі / высокакваліфікаваных спецыялістаў. Ён захоўвае ўстойлівасць і ўзнаўляецца праз інфармацыйныя каналы і сацыяльную структуру.
- Узровень шчырай дэклараванай падтрымкі ва ўмовах ананімнага апытання і меркаваныя (як і афіцыйныя) вынікі выбараў адлюстроўваюць альбо адміністрацыйную мабілізацыю і фальсіфікацыі, альбо шырокую гатоўнасць грамадства “наблізіцца” да праўладнай пазіцыі ў публічных паводзінах. Вялікая “шэрая зона” дэманструе, што многія не хочуць раскрываць сваю рэальную пазіцыю (страх, недавер да ананімнасці, перавага прыватнай нязгоды).
- У выніку спалучэнне ўмеранай шчырай падтрымкі, высокага інстытуцыянальнага кантролю і самацэнзуры фарміруе мадэль “кіраванай легітымнасці”, дзе рэжым падтрымліваецца і адміністрацыйна мабілізуецца, але пры гэтым не пазбаўлены скрытага патэнцыялу незадаволенасці — “латэнтнага рэсурсу” для будучай мабілізацыі, калі з’явіцца арганізаваная альтэрнатыва і знешнія трыгеры.

# ВЫБАРЫ 2020

## Кантэкст

2020 год адзначыўся найбуйнейшым палітычным крызісам у гісторыі не залежнай Беларусі. Спадарожнымі фактарамі сталі адмаўленне ўладай COVID, рост смяротнасці і адсутнасць падтрымкі грамадства, што пацягнула падзенне даверу да дзяржавы. Гэта суправаджалася эканамічнымі пагаршэннямі: стагнацыяй даходаў, падзеннем ВУП, ростам не задаволенасці грамадства. Вынікам стала фарміраванне новага пакалення палітычнай суб'ектнасці: рост гарызантальных сетак, фарміраванне пратэстных настрояў у рэгіёнах, з'яўленне феномену "жаночага лідарства", аб'яднанне электарату на маральнай аснове.

Выбары 2020 года адбыліся 9 жніўня, па афіцыйных звестках у іх прынялі ўдзел 84,3% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў. У якасці іх афіцыйных вынікаў былі абвешчаны наступныя лічбы:[20]

- за Лукашэнка А.Г. — 80,1%
- за Ціханоўскую С.Г. — 10,1%
- за Канапацкую А.А. — 1,7%
- за Дзмітрыева А.У. — 1,2%
- за Чэрачня С.В. — 1,1%

У сувязі з парушэннем уладамі афіцыйных працэдур АБСЕ назіранне за выбарным працэсам не праводзіла[21].

Савет ЕС абвясціў прэзідэнцкія выбары 9 жніўня не свабоднымі і несправядлівымі. Надзейныя паведамленні паказваюць, што выбарчы працэс не адпавядаў заканадаўству Беларусі і яе міжнародным абавязацельствам. А. Лукашэнка не мае дэмакратычнай легітымнасці. У сувязі з гэтым, ЕС падтрымлівае законныя патрабаванні беларускага народа аб правядзенні новых, свабодных і справядлівых прэзідэнцкіх выбараў у адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі і пад наглядам БДІПЧ АБСЕ[22].

## Вынікі даследавання[23]

Дадзеныя даследавання пра вынікі выбараў кардынальна супярэчаць афіцыйна агучаным лічам.

Паводле самасправаздачных дадзеных, траціна выбаршчыкаў (33%) прагаласавалі за альтэрнатыўнага кандыдата — Святлану Ціханоўскую, Аляксандр Лукашэнка атрымаў падтрымку толькі кожнага чацвёртага беларуса (21%).

20. "Сообщение об итогах выборов Президента Республики Беларусь в 2020 году", ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
21. "ODIHR will not deploy election observation mission to Belarus due to lack of invitation", ОБСЕ, 5 лістапада 2025
22. "Заключения Совета ЕС относительно Беларуси от 12 октября 2020 г", Совет ЕС, 5 лістапада 2025
23. Даследаванне 2020 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная нацыянальная квотная выбарка 1415 рэспандэнтаў

Калі Вы прынялі ўдзел у выбарах Прэзідэнта 9 жніўня, то за каго з кандыдатаў Вы аддалі свой голас? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзмітрыеў Андрэй | 1,3 | 1,3 | 1,3 | 1,0 | 1,6 | 2,5 | 1,9 | 0,4 | 0,3 |
| Канапацкая Ганна | 0,5 | 0,1 | 0,9 | 0,5 | 0,6 | 0,7 | 0,4 | 0,4 | 0,6 |
| Лукашэнка Аляксандр | 20,9 | 14,6 | 26,0 | 5,6 | 6,5 | 11,9 | 16,5 | 26,0 | 46,6 |
| Ціханаўская Святлана | 33,3 | 37,7 | 29,6 | 52,4 | 45,4 | 39,0 | 35,7 | 22,9 | 17,2 |
| Чэрачэнь Сяргей | 0,4 | 0,0 | 0,7 | 0,5 | 0,3 | 0,0 | 0,9 | 0,0 | 0,6 |
| Супраць усіх | 6,6 | 6,9 | 6,3 | 4,9 | 7,0 | 5,1 | 8,6 | 8,1 | 5,0 |
| Я не галасаваў(ла) | 11,3 | 13,9 | 9,3 | 11,9 | 14,0 | 14,4 | 8,3 | 9,4 | 10,5 |
| Я не хачу адказваць на гэтае пытанне | 25,7 | 25,5 | 25,9 | 23,1 | 24,6 | 26,4 | 27,7 | 32,8 | 19,1 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзмітрыеў Андрэй | 1,3 | 0,0 | 0,8 | 4,2 | 2,0 | 1,4 | 0,9 | 0,0 | 1,3 | 1,2 |
| Канапацкая Ганна | 0,5 | 0,0 | 1,2 | 0,0 | 1,2 | 0,4 | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 0,5 |
| Лукашэнка Аляксандр | 20,9 | 25,2 | 19,4 | 18,3 | 25,7 | 14,1 | 21,8 | 26,8 | 19,2 | 27,1 |
| Ціханаўская Святлана | 33,3 | 30,6 | 42,1 | 28,2 | 34,2 | 35,4 | 35,4 | 21,3 | 33,6 | 32,0 |
| Чэрачэнь Сяргей | 0,4 | 0,5 | 0,6 | 0,0 | 0,4 | 0,8 | 0,0 | 0,0 | 0,4 | 0,2 |
| Супраць усіх | 6,6 | 6,3 | 5,0 | 9,5 | 4,5 | 9,0 | 4,7 | 6,5 | 6,9 | 5,3 |
| Я не галасаваў(ла) | 11,3 | 15,9 | 8,4 | 8,8 | 7,7 | 15,7 | 9,6 | 11,0 | 12,2 | 8,1 |
| Я не хачу адказваць на гэтае пытанне | 25,7 | 21,5 | 22,5 | 31,1 | 24,2 | 23,2 | 27,0 | 34,3 | 25,8 | 25,5 |

Звяртае на сябе ўвагу факт значнай адмовы ад адказу на гэтае пытанне, але наўрад ці ён сведчыць пра падтрымку дзеючай улады, а хутчэй — пра страх выразіць рэальную пазіцыю. Самае характэрнае, што традыцыйныя рэгіёны падтрымкі дзеючай улады істотна змянілі пазіцыі. Больш за тое, упершыню падтрымка альтэрнатыўнай пазіцыі ў сельскай мясцовасці стала супастаўнай з меркаваннем гарадскога насельніцтва.

Гэта драматычны злом традыцыйнай аўтарытарнай мадэлі, дзе дзейны прэзідэнт заўсёды меў каля 50% падтрымкі ў самасправаздачах насельніцтва.

Пра злом папярэдняй сістэмы сведчаць і ацэнкі арганізацыі выбарчага працэсу. Каля траціны апытаных не змаглі ацаніць арганізацыйныя аспекты выбарчай кампаніі, што зноў жа хутчэй звязана з засцярогай вызначыць сваю пазіцыю. Але большасць рэспандэнтаў, хто вырашыў агучыць сваё меркаванне, выказалі крытычныя пазіцыі. Прычым нават сярод традыцыйных груп падтрымкі дзейнай улады: жанчыны, людзі старэйшага ўзросту, жыхары сельскай мясцовасці.

Лаяльныя групы перасталі быць маналітамі.

*У 2020 годзе электаральная база Лукашэнкі сціснулася, але ядро засталося традыцыйным:*
*– гэта хутчэй жанчыны, людзі пераважна больш сталага ўзросту (старэй за 65), вяскоўцы і жыхары Магілёўскай вобласці.*

Як вы ацэньваеце наступнае: (%)

| | 1: КЕПСКА | 2 | 3 | 4 | 5: ВЫДАТНА | ЦЯЖКА СКАЗАЦЬ | СЯРЭДНЯЕ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Арганізацыя выбарчага працэсу на этапе фармавання ініцыятыўных груп і збору подпісаў за вылучэнне кандыдатаў | 16,9 | 10,5 | 18,3 | 15,6 | 6,6 | 32,1 | 13,6 |
| Арганізацыя выбарчага працэсу на этапе фармавання выбарчых камісій | 18,2 | 10,8 | 16,0 | 13,0 | 6,0 | 36,0 | 12,8 |
| Арганізацыя працы выбарчых камісій не пасрэдна на выбарчых участках | 20,8 | 10,1 | 15,1 | 15,2 | 8,8 | 30,0 | 14,0 |
| Праца выбарчых камісій і ЦВК па падліку галасоў | 34,8 | 10,2 | 8,8 | 8,6 | 4,6 | 32,9 | 13,4 |

Сістэма выбараў у 2020 годзе ўспрымаецца не проста як не сумленная, а як цалкам дыскрэдытаваная.

2020 год адзначыўся беспрэцэдэнтнымі рэпрэсіямі: у асноўным увага сканцэнтравана на пасляжнівеньскіх падзеях, хоць перадвыбарчая сітуацыя выглядала не менш радыкальна.

Паўторым, упершыню за ўсю гісторыю аўтарытарызму ў Беларусі ўлады адмовіліся ад бачнасці легітымацыі і не распачалі не абходных дзеянняў для назірання за выбарамі місіі АБСЕ.

2020 год стаў пераломным годам, калі лаяльнасць 2015-га ператварылася ў адкрыты пратэст, а схаваны раскол — у масавую мабілізацыю менавіта па прычыне таго, што беларуская рэпрэсіўная сістэма ў 2020 г. дасягнула маштабаў, якія выходзяць за рамкі электаральнага ціску. Яна цалкам ператварылася ў гвалтоўны рэжым, які выкарыстоўвае прымус як частку палітычнага працэсу.

Відавочна, што сітуацыя выбараў 2020 года выклікала пратэстны водгук: падчас апытання многія рэспандэнты

не пабаяліся прызнаць той факт, што сутыкаліся з рэпрэсіямі ўладаў. Кожны чацвёрты звярнуў увагу на прымяненне сілы пры разгоне дэманстрацый, амаль кожны трэці стаў сведкам сілавога разгону мітынгаў, кожны пяты сутыкаўся з затрыманнямі.

Варта звярнуць увагу, што ўпершыню за ўсю гісторыю электаральных даследаванняў у Беларусі 20,5% насельніцтва ўказалі, што сутыкаліся з прымусам да датэрміновага галасавання.

Змянілася тэрытарыяльная карціна выбарчай сітуацыі: пра пратэстныя настроі заявілі ў абласцях, традыцыйна падтрымліваючых уладу (напрыклад, у Брэсцкай і Гродзенскай вобласці).

Ці сутыкаліся вы з чым-небудзь з пералічанага? (%)

| | ТАК | НЕ | НЕ ХАЧУ АДКАЗВАЦЬ НА ГЭТАЕ ПЫТАННЕ |
|---|---|---|---|
| Прымус паставіць подпіс за аднаго з кандыдатаў у прэзідэнты пры яго вылучэнні | 15,1 | 70,0 | 14,9 |
| Прымус да датэрміновага галасавання | 20,5 | 63,7 | 15,7 |
| Пагрозы па месцы працы і вучобы, у выпадку ўдзелу ў несанкцыянаваных мітынгах або выказвання свайго меркавання якім-небудзь іншым чынам | 18,3 | 64,4 | 17,2 |
| Затрыманні, арышты па палітычных прычынах | 21,7 | 62,2 | 16,1 |
| Стаў сведкам сілавога разгону вулічных мітынгаў, дэманстрацый | 27,8 | 55,8 | 16,4 |
| Ужыванне сілы з боку сілавых структур пры разгоне, затрыманні, арышце | 24,9 | 57,5 | 17,6 |

## Рэзюме

Паслявыбарчае апытанне 2020 года дакументуе татальны палітычны крызіс.

- У 2020 годзе рэжым сутыкнуўся з беспрэцэдэнтнай адмовай ад лаяльнасці з боку грамадства.
- Грамадства масава выйшла з “зоны страху”, раскол паміж грамадствам і дзяржавай стаў адкрытым.
- Дзяржава страціла кантроль над легітымнасцю, але адказала рэпрэсіямі беспрэцэдэнтнага маштабу.
- Калі выбары 2010–2015 паказвалі павольную эрозію легітымнасці, то 2020 год стаў момантам, калі гэтая эрозія стала незваротнай.
- Сістэма страціла маральную і палітычную апору і дагэтуль замяняе яе рэпрэсіямі.

# РЭФЕРЭНДУМ 2022

## Кантэкст

Рэспубліканскі рэферэндум 27 лютага 2022 года стаў кульмінацыяй трох працэсаў, якія вызначылі тагачасную сітуацыю.

– наступствы пратэстаў 2020–2021 гадоў, вынікам якіх сталі дзясяткі тысяч затрыманняў, сотні палітзняволеных, знішчэнне не залежных медыя, ліквідацыя ўсіх НДА і партый, укараненне татальнага страху. Палітычная суб'ектнасць была сістэмна разбурана.

– рэзкае ўзмацненне залежнасці ад Расіі: рэжым страціў аўтаномію пасля 2020 года, і яна стала яго галоўным гарантам — у палітычным дыскурсе стала дамінаваць рыторыка "пагрозы звонку".

– за тры дні да рэферэндуму Расійская Федэрацыя ўварвалася ва Украіну, Беларусь прадаставіла для гэтага сваю тэрыторыю. Гэта выклікала грамадскі шок, эфект "асаднага становішча", рэзкі рост няўпэўненасці і страху, калапс знешніх каналаў інфармацыі.

Рэферэндум праходзіў у атмасферы вайны і падаўлення, што зрабіла яго не актам выбару, а рытуалам дэманстрацыі кантролю.

Галоўнае пытанне рэферэндуму: "Ці прымаеце Вы змены і дапаўненні Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?". Па афіцыйных звестках у рэферэндуме прынялі ўдзел 78,6% ад агульнай колькасці выбаршчыкаў.

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала 78,6%. У якасці іх афіцыйных вынікаў былі абвешчаны наступныя лічбы[24]:

- "За" прыняцце рашэння па вынесеным на рэферэндум пытанні 82,9% ад грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні.
- "Супраць" прагаласавала 12,8% ад грамадзян, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

Відавочна, што ані падрыхтоўка, ані вынікі рэферэндуму не атрымалі міжнароднай падтрымкі і сталі яшчэ адной нагодай для выказвання афіцыйнымі ўладамі прэтэнзій АБСЕ[25].

## Вынікі даследавання[26]

Вынікі даследавання дэманструюць моцную дэпалітызацыю грамадства.

Яшчэ ў 2020 годзе амаль ніхто не ўдзельнічае ні ў чым, акрамя галасавання, але прыкметнымі з'яўляюцца пратэстныя настроі, то ў 2022 любы ўдзел стаў небяспечным, а несанкцыянаваны — немагчымым. Моладзь увогуле сыходзь у ігнараванне палітычнага ўдзелу. Гэта разбуранае грамадзянскае поле.

24. "Сообщение Центральной комиссии об итогах республиканского референдума 27 февраля 2022 года", ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
25. "Referendum 2022: Final report", Belarusian Helsinki Committee and the Human Rights Center "Viasna", 5 лістапада 2025
26. Даследаванне 2020 г. Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, рэпрэзентатыўная нацыянальная квотная выбарка 1474 рэспандэнты

У якой форме вы прымаеце ўдзел у палітычным жыцці краіны? (%)

| | 2020 | 2022 | ПРИРОСТ |
|---|---|---|---|
| Удзел у выбарах Прэзідэнта | 85,2 | 74,4 | -10,8 |
| Удзел у выбарах у Парламент | 34,5 | 30,2 | -4,2 |
| Удзел у выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў | 35,0 | 35,4 | 0,4 |
| Удзел у дзейнасці грамадскіх арганізацый, рухаў, фондаў | 1,6 | 1,9 | 0,2 |
| Удзел у дзейнасці палітычных партый | 0,3 | 0,6 | 0,3 |
| Удзел у рабоце органаў мясцовага самакіравання | 0,6 | 0,9 | 0,3 |
| Удзел у рабоце прафсаюзных арганізацый | 6,2 | 7,1 | 0,9 |
| Удзел у грамадскім абмеркаванні законапраектаў і іншых важных дзяржаўных рашэнняў | 0,5 | 0,4 | 0,0 |
| Падрыхтоўка і правядзенне выбарчай кампаніі (збор подпісаў, агітацыя, праца ў выбарчай камісіі і да т.п.) | 1,6 | 1,7 | 0,1 |
| Валанцёрства, удзел у ініцыятыўных групах | 2,6 | 1,6 | -0,9 |
| Падпісанне зваротаў, петыцый у органы ўлады і кіравання | 6,8 | 1,2 | -5,5 |
| Удзел у санкцыянаваных мітынгах і дэманстрацыях | 11,0 | 3,2 | -7,7 |
| Удзел у не санкцыянаваных мітынгах, пікетах, забастоўках | 6,4 | 1,8 | -4,6 |
| Іншае | 0,5 | 0,1 | -0,5 |
| Не ўдзельнічаю ў палітычным жыцці краіны | 13,6 | 24,5 | 10,9 |

Самым паказальным з’яўляецца пытанне аб неабходнасці змяненняў у дзейную Канстытуцыю. Каля 40% насельніцтва ўказалі на іх мэтазгоднасць, а больш за 40% сышлі ў шэрую зону.

Гэта адносіцца абсалютна да ўсіх сацыяльных кантынгентаў. Такі паказчык робіць відавочнай адсутнасць інфармаванасці, страх выказвацца, усведамленне, што “меркаванне не мае сэнсу”, поўную дэвальвацыю палітыкі як сферы выбару.

Ці патрэбныя, на Ваш погляд, змены ў дзейную Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-29 | 30-34 | 45-64 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 17,3 | 18,1 | 16,7 | 19,2 | 19,7 | 17,8 | 11,7 |
| Хутчэй так | 22,8 | 24,3 | 21,7 | 21,2 | 21,6 | 25,3 | 21,5 |
| Хутчэй не | 7,6 | 8,4 | 6,9 | 7,6 | 7,9 | 7,5 | 7,0 |
| Не | 8,9 | 9,7 | 8,2 | 7,9 | 10,8 | 7,7 | 8,7 |
| Цяжка адказаць | 43,4 | 39,5 | 46,6 | 44,0 | 40,0 | 41,8 | 51,2 |

Аналагічным чынам больш за 40% не ў стане вызначыцца, якія змены патрэбны ў дзеючую Канстытуцыю.

Відавочна, людзі засцерагаюцца адсутнасці сацыяльных гарантый, не адчуваюць сябе ў бяспецы, адчуваюць абмежаванасць правоў і свабод — забеспячэнне менавіта такіх гарантый выбаршчыкі лічаць мэтазгодным. Людзі не разумеюць сутнасці рэформы, не цікавяцца, не бачаць сябе суб’ектамі палітычнага выбару.

Якія змены патрэбны ў дзейную Канстытуцыю? (%)

| | |
|---|---|
| Замацаванне нацыянальных традыцый і існуючага ўкладу | 12,2 |
| Захаванне асноўных сацыяльных гарантый (на ахову здароўя, сацыяльнае забеспячэнне ў старасці, працу, адукацыю і г.д.) | 41,8 |
| Пашырэнне грамадзянскіх правоў і свабод грамадзян | 26,7 |
| Партыйнае будаўніцтва і павышэнне ролі партый у грамадска-палітычным жыцці краіны | 4,5 |
| Пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж асноўнымі галінамі ўлады | 11,8 |
| Пашырэнне правоў органаў мясцовага самакіравання | 5,8 |
| Узмацненне гарантый бяспекі людзей і дзяржавы | 28,6 |
| Лібералізацыя дзяржаўнай палітыкі і грамадскага жыцця | 8,9 |
| Адмена смяротнага пакарання | 14,7 |
| Іншае | 2,9 |
| Цяжка адказаць | 42,1 |

Каля траціны насельніцтва падтрымлівае правядзенне Рэферэндуму, кожны пяты — не , яшчэ больш за траціну рэспандэнтаў не змаглі вызначыць сваю пазіцыю. Кожны дзясяты ў краіне ўвогуле пра гэта не ведае. Старэйшае пакаленне яшчэ менш за моладзь разумее сэнс дадзенага мерапрыемства. Людзі не вераць, што іх меркаванне мае сэнс, і пазбягаюць ацэнак.

Як Вы ставіцеся да правядзення ў краіне рэферэндуму па змяненні дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-29 | 30-34 | 45-64 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Падтрымліваю | 12,2 | 12,8 | 11,8 | 9,5 | 9,9 | 12,9 | 16,2 |
| Хутчэй за падтрымліваю | 19,3 | 20,7 | 18,1 | 17,9 | 19,6 | 23,1 | 13,0 |
| Хутчэй не падтрымліваю | 9,9 | 10,8 | 9,3 | 8,2 | 11,6 | 10,7 | 7,3 |
| Не падтрымліваю | 11,2 | 12,9 | 9,8 | 9,6 | 14,0 | 11,0 | 8,4 |
| Нічога пра гэта не ведаю | 12,5 | 10,4 | 14,1 | 15,1 | 13,2 | 11,6 | 11,1 |
| Цяжка адказаць | 34,9 | 32,4 | 37,0 | 39,8 | 31,8 | 30,6 | 44,1 |

Практычна ідэнтычныя дадзеныя мы маем адносна ацэнак перспектыў удзелу ў рэферэндуме: больш за траціну не вызначыліся, каля 40 % гатовыя ўдзельнічаць — і не факт, што гэта тыя, хто ідзе па перакананнях, а не з-за страху, звычкі або адміністрацыйнага ціску. Кожны чацвёрты не хоча ўдзельнічаць.

Ці плануеце Вы ўзяць удзел у рэферэндуме па змяненні дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? (%)

| | |
|---|---|
| Так | 17,9 |
| Хутчэй так | 23,0 |
| Хутчэй не | 8,8 |
| Не | 16,0 |
| Цяжка адказаць | 34,3 |

Спроба ацаніць перспектывы і рэзультатыўнасць рэферэндуму выклікае татальнае не разуменне: больш за палову краіны не здольна сфармуляваць сваё меркаванне на гэты конт.

Прыкладна роўная колькасць (менш за 20%) чакаюць якіх-небудзь паляпшэнняў або лічаць, што сітуацыя не зменіцца. Гэта даволі ўнікальны паказчык, які сведчыць пра палітычнае аслупяненне, вывучаную бездапаможнасць і стан калектыўнай траўмы пасля 2020–2021 гадоў.

Як зменіцца сітуацыя ў краіне пасля правядзення рэферэндуму? (%)

| | |
|---|---|
| Адбудуцца значныя станоўчыя змены | 9,0 |
| Адбудуцца нязначныя паляпшэнні | 10,9 |
| Ніяк не паўплывае | 17,4 |
| Сітуацыя значна пагоршыцца | 6,5 |
| Сітуацыя нязначна пагоршыцца | 1,8 |
| Цяжка адказаць | 54,3 |
| Няма адказу | 0,4 |

## Рэзюме

Такім чынам, да лютага 2022 года грамадства дэмаралізавана: значны памер “шэрай зоны” у 2022 годзе — гэта не столькі не інфармаванасць і апатыя, колькі палітычна інтэрыярызаваная бездапаможнасць. Людзі не разумеюць навошта рэферэндум, не вераць, што ён мае значэнне, не бачаць, што іх удзел не шта зменіць — гэта знішчэнне палітычнай суб’ектнасці.

Рэферэндум — гэта не выбар, а адміністрацыйная працэдура і дзяржаўны рытуал, чарговая фармальнасць, якая не зразумела, навошта патрэбна. Сацыяльныя страхі перакрываюць палітычныя, няма ні падтрымкі, ні пратэсту, галоўнае жаданне — “абы не стала горш”.

# ВЫБАРЫ 2025

## Кантэкст

Прэзыдэнцкія выбары 2025 года праходзілі ва ўмовах узмоцненай ізаляцыі Беларусі на міжнароднай арэне пасля пачатку паўнамаштабнай вайны ва Украіне.

Галасаванне упершыню праходзіла без замежных участкаў і ва ўмовах працяглых рэпрэсій у краіне. Акрамя таго, выбары ўпершыню адбываліся па патрабаваннях новай, прынятай у 2022 годзе Канстытуцыі. У прыватнасці, па больш жорсткім патрабаванням да кандыдатаў на пасаду прэзідэнта — па працягласці пражывання, грамадзянству, абмежаванням для асоб з замежным грамадзянствам/відам на жыхарства і інш.

Асноўнымі кандыдатымі на тых выбарах былі: Аляксандр Лукашэнка — дзеючы кіраўнік дзяржавы; Сяргей Гайдукевіч — старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі; Ганна Канапацкая — беларускі палітык, прадпрымальніца, юрыстка; Сяргей Сыранкоў — першы сакратар ЦК Камуністычнай партыі Беларусі; Аляксандр Хіжняк — старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці.

Паводле афіцыйных звестак, яўка на выбарах склала 85,7%. У якасці афіцыйных вынікаў выбараў былі абвешчаны наступныя лічбы[27]:

- за Лукашэнку — 86,7%
- за Сыранкова — 3,2%
- за Гайдукевіча — 2,0%
- за Канапацкую — 1,9%
- за Хіжняка — 1,7%

Яшчэ да выбараў — 9 студзеня 2025 года — БДІПЧ апублікаваў заяву, выказаўшы шкадаванне ў сувязі з тым, што ўлады Беларусі не запрасілі назіральнікаў АБСЕ на прэзідэнцкія выбары.

У заяве АБСЕ ад адзначалася, што гэта ўжо трэці раз пасля прэзідэнцкіх выбараў у жніўні 2020 года, калі БДІПЧ не можа назіраць за выбарамі ў Беларусі праз адсутнасць своечасовага запрашэння[28].

## Вынікі даследавання[29]

Больш за 75% ацэньваюць маючыя адбыцца выбары як важную палітычную падзею, пры гэтым больш за траціну наогул не сочыць за выбарчай кампаніяй. Нават сярод традыцыйна больш уцягнутага старэйшага пакалення ёю не цікавіцца кожны чацвёрты.

Ускосныя адзнакі ўспрымання выбарчага працэсу збоку ўласнага сацыяльнага асяроддзя наогул размытыя. Гарадскія жыхары лічаць выбары важнымі як рытуал, але не як палітычную падзею, палітычны інтарэс нізкі, эмоцыі слабыя, надзеі адсутнічаюць. Гэта класічны сіндром “аўтарытарнай палітызацыі без зместу”: знешне — дэкларуемая значнасць важнасць, унутрана — адчуванне пустаты.

Сістэмная дэпалітызацыя захоўваецца, але ўжо без ранейшага страху: людзі проста не лічаць выбары полем, дзе не шта вызначаецца.

27. “Сообщение об итогах выборов Президента Республики”, ЦИК Беларуси, 5 лістапада 2025
28. “No election observation mission in Belarus due to lack of invitation, in breach of OSCE commitments”, ОБСЕ, 5 лістапада 2025
29. “Успрыманне выбарчай кампаніі і сітуацыі ў Беларусі”, ChatamHouse, 5 лістапада 2025

Наколькі важнай ці не важнай для краіны падзеяй вы лічыце будучыя выбары прэзідэнта? (%)

| | |
|---|---|
| Зусім не важнае | 10,9 |
| Хутчэй не важнае | 4,9 |
| Цяжка адказаць | 8,0 |
| Хутчэй важнае | 21,1 |
| Вельмі важнае | 55,1 |

Пры гэтым больш за трэць насельніцтва не цікавілася інфармацыяй аб выбарах. Ключавы парадокс атрыманых дадзеных у тым, што, нягледзячы на адсутнасць цікавасці да выбараў, больш за 70% планавалі свой удзел у іх, а траціна збіралася галасаваць датэрмінова.

Ці будзеце вы галасаваць на маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах у студзені 2025 года? (%)

| | |
|---|---|
| Дакладна не буду | 11,4 |
| Хутчэй не буду | 6,9 |
| Цяжка адказаць | 9,3 |
| Хутчэй за буду | 22,5 |
| Дакладна буду | 49,9 |

І ў тлумачэнні матывацыі ўдзелу сітуацыя вяртае нас у фармалізм 2015 года: выбары — гэта проста грамадзянскі абавязак.

Чаму вы будзеце галасаваць? (% ад тых, хто планаваў галасаваць)

| | |
|---|---|
| Гэта грамадзянскі абавязак | 29,5 |
| Важна для краіны, уплывае на будучыню | 17,5 |
| Падтрымаць Лукашэнку | 7,6 |
| Дзеля стабільнасці, спакою, міру | 7,1 |
| Зрабіць выбар, аддаць свой голас | 6,3 |
| Каб рэалізаваць свае права | 6,2 |
| Бо кожны голас важны | 5,1 |
| Гэта важна, трэба, хачу (без удакладненняў) | 5,7 |
| Заўсёды галасуюць | 2,0 |
| Іншае | 9,2 |
| Цяжка адказаць | 3,7 |

Не менш цікавая і матывацыя няўдзелу: больш за палову рэспандэнтаў лічаць вынік наканаваным, астатнія не маюць магчыцмасці ці проста не хочуць па розных прычынах.

Чаму вы не будзеце галасаваць? (% ад тых, хто не планаваў галасаваць)

| | |
|---|---|
| Вынік наканаваны, няма сэнсу | 53,0 |
| Няма магчымасці | 18,8 |
| Не жадаюць (без удакладненняў) | 14,6 |
| У цэлым не галасуюць | 5,0 |
| Няма добрых кандыдатаў | 2,6 |
| Іншае | 3,5 |
| Цяжка адказаць | 2,5 |

Удзел у выбарах — гэта аўтаматызм і завучаная норма “трэба хадзіць”, гэта не палітычны акт, а пасіўная адаптацыя ва ўмовах адсутнасці рэальных альтэрнатыў.

Пратэсту ўжо няма, ёсць татальная дэматывацыя. Гэта можна назваць палітычным фаталізмам, пад якім мы разумеем стан грамадства, у якім грамадзяне перакананыя, што палітычныя працэсы цалкам не падкантрольныя іх волі, не паддаюцца змене і разгортваюцца па загадзя зададзеным сцэнары. Тут людзі не абавязкова адчуваюць страх або агрэсію — яны адчуваюць бессэнсоўнасць уласных намаганняў і трансфармуюць стратэгію паводзін у форму адаптыўнага выжывання.

Амаль траціна выбаршчыкаў у той ці іншай ступені згаджаецца з тэзісам аб прадвызначанасці вынікаў выбараў, кожны пяты ідзе ў шэрую зону. Упершыню за ўсю гісторыю даследаванняў у Беларусі сярод старэйшых узростаў больш згодных з гэтым сцвярджэннем, чым сярод моладзі.

Як Вы ставіцеся да правядзення ў краіне рэферэндуму па змяненні дзеючай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь? (%)

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-29 | 30-34 | 45-64 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Зусім не згодзен(на) | 29,8 | 28,8 | 30,5 | 34,6 | 29,2 | 28,3 | 31,1 |
| Хутчэй не згодзен(на) | 17,1 | 14,0 | 19,5 | 16,3 | 19,5 | 15,1 | 19,4 |
| Цяжка адказаць | 22,5 | 17,3 | 26,5 | 36,1 | 19,8 | 22,1 | 10,7 |
| Хутчэй згодзен(на) | 13,5 | 17,2 | 10,6 | 7,3 | 12,8 | 14,2 | 23,9 |
| Цалкам згодзен(на) | 17,2 | 22,6 | 12,8 | 5,8 | 18,7 | 20,4 | 14,8 |

Гарадское насельніцтва дэманструе кагнітыўную дваістасць: людзі адначасова разумеюць, што выбары не сумленныя, але дэкларуюць афіцыйна-лаяльныя ацэнкі, калі пытанні носяць “фарматны” характар.

Вельмі характэрным з’яўляецца адказ на пытанне аб ацэнках сітуацыі ў выпадку захавання ў больш за 15-летняй даляглядзе дзеючага рэжыму: мы маем класічныя 40-50 % падтрымкі электарату. І гэтая тэза пацвярджаецца адказам на пытанне аб асноўных ідэях передвыбарнай кампаніі дзейнага прэзідэнта, на якія змаглі адказаць менш за 40% рэспандэнтаў.

Уявіце сітуацыю: праз шэсць гадоў, пасля прэзідэнцкіх выбараў 2030 года, Прэзідэнтам Беларусі застаецца Аляксандр Лукашэнка (%)

| | |
|---|---|
| Вельмі дрэнна | 14,7 |
| Хутчэй за дрэнна | 10,5 |
| Цяжка адказаць | 26,5 |
| Хутчэй добра | 17,6 |
| Вельмі добра | 30,7 |

Адной з задач даследавання была ацэнка эмоцый, якія адчуваюць гарадскія жыхары ў адносінах да выбараў. Нягледзячы на тое, што мы не ставім тут за мэту іх падрабязны аналіз, гэта адзін з галоўных індыкатараў стану гарадской Беларусі ў 2025: дамінуючая эмоцыя — адсутнасць эмоцый.

Мы маем справу з эмацыйнай дэсенсібілізацыяй — поўным адхіленнем і эмацыйнай пустэчай як вынікам палітычнага выгарання.

Папярэднюю структурную мадэль гарадской палітычнай пасіўнасці можна прадставіць у выглядзе чатырох тыпаў:

- адаптыўны ўдзел (прыкладна 45-55%) — ходзяць на выбары па звычцы, гатовыя галасаваць, але без разумення сэнсу, рытуальна даюць пазітыўныя адказы;
- дыстанцаваная апатычнасць (25-30%) — грунтуецца на максімальным пазбяганні канфлікту пры поўнай адсутнасці цікавасці і эмацыйнай пустаце;
- ціхі скептыцызм (10-15%) — усвядомленая адхіленасць пры адсутнасці пратэсту, схаваны недавер і палітычнае пазбяганне;
- прыхаваная лаяльнасць (5-10%) — падтрымка стабільнасці і рэжыму, але хутчэй па звычцы, па матывах бяспекі або бюракратычнай убудаванасці.

## Рэзюме

- Даследаванне 2025 года па гарадскому насельніцтву Беларусі паказвае поўнае ператварэнне выбараў у адміністрацыйны рытуал і канчатковую дэпалітызацыю насельніцтва.
- Гарадскія жыхары не вераць у выбары, але і не пратэстуюць: яны эмацыйна выключаны. Людзі жывуць у рэжыме асабістага выжывання і эмацыйнай эканоміі — гэта прыгнечаная траўма, вывучаная бездапаможнасць, эмацыйнае аддзяленне.
- Ва ўмовах, калі сотні людзей пакінулі краіну, знішчаныя апазіцыя, не залежныя медыя і НДА, большасць палітычна актыўных жыхароў знаходзіцца пад ціскам, мы маем справу з новым, інстытуцыйна замацаваным этапам аўтарытарнай эвалюцыі. Гэта не азначае адсутнасць расколу, але яго пераход у новую фазу: не паміж уладай і апазіцыяй, а паміж унутрана выгарэлымі і адхіленымі і тэхнакратычна-лаяльнымі.
- Прычым нават лаяльнасць вельмі ўмоўная, паколькі мы маем справу са станам масавай свядомасці, у якім грамадства губляе ўяўленне аб уласнай палітычнай суб'ектнасці і ўспрымае палітычны парадак як нязменны і наканаваны, што вядзе да рытуальнага, адаптыўнага ўдзелу і эмацыйнай адхіленасці. У існуючых умовах палітычнага фаталізму палітычны ўдзел цалкам ператвараецца ў рытуал, з'яўляецца эмацыйная абясцэненасць і здранцвенне, нормы ўдзелу застаюцца, але без зместу, людзі пераходзяць да індывідуальных стратэгій выжывання — сама ідэя палітыкі знікае, замяняючыся чаканнем, што "нічога ад нас не залежыць і так будзе заўсёды".
- Асноўныя асаблівасці выбараў 2025 года: абвешчана "новая канстытуцыйная сістэма", але без палітычнай канкурэнцыі, альтэрнатыўныя кандыдаты або адсутнічаюць, або іх роля тэхнічная. Задача выбараў — нармалізацыя, дэманстрацыя парадку, вяртанне да рытуальнасці. Фактычна мы маем справу з сітуацыяй 10-гадовай даўніны.

# ЭЛЕКТАРАЛЬНЫЯ СІТУАЦЫІ (2001-2025). СХЕМА

| ПЕРЫЯД | КЛЮЧАВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ЭЛЕКТАРАЛЬНЫХ ПАВОДЗІНАХ | ФАКТАРЫ ЎПЛЫВУ |
|---|---|---|
| 2001-2006 (Фарміраванне аўтарытарнай стабільнасці) | Высокая самасправаздачная яўка (86-92%); падтрымка Лукашэнкі ў самасправаздачах 45–63% (ніжэй за афіцыйныя 75–83%); рост датэрміновага галасавання (18-32%); палова насельніцтва не верыць ва ўплыў на падзеі; палярызацыя па ўзросце (моладзь больш крытычная, пажылыя лаяльней); нізкі давер да СМІ і працэсу (30-50% незадаволеныя). | Адміністрацыйны кантроль (прапаганда, ціск на бюджэтнікаў); адсутнасць альтэрнатыў; эканамічная стабільнасць як аснова лаяльнасці; рэпрэсіі пасля пратэстаў (2006); уплыў дзяржСМІ; патэрналізм і страх змен. |
| 2010-2015 (Кансервацыя лаяльнасці і эрозія даверу) | Яўка 80-87% (самасправаздача блізкі да афіцыйнага); падтрымка Лукашэнкі ~45% у намерах (афіцыйна 83%); рост "шэрай зоны" (18-20% не могуць адказаць); прагматычны інтарэс да выбараў (грамадзянскі доўг ~50%); скептыцызм да вынікаў (давер ~60%); пераход да інтэрнэту сярод моладзі; апатыя як норма. | Эканамічныя крызісы (падзенне даходаў, рэгіянальная нестабільнасць); узмацненне цэнзуры і манаполіі дзяржСМІ; адміністрацыйная мабілізацыя (датэрміновае галасаванне як зручны інструмент); адсутнасць рэальнай апазіцыі; знешнія пагрозы (Украіна 2014) узмацнілі акцэнт на стабільнасць. |
| 2020 (Крызіс легітымнасці і мабілізацыя) | Самасправаздачная падтрымка Лукашэнкі 21%, апазіцыі (Ціханоўская) 33%; яўка высокая, але 20% адзначаюць прымус да датэрміновага; нізкі давер да працэсу (большасць крытыкуе арганізацыю); масавая пратэстная актыўнасць; разрыў лаяльных груп (нават сяло і пажылыя крытычныя); адкрытае прызнанне рэпрэсій (25–30% сведкі гвалту). | Масавыя фальсіфікацыі і рэпрэсіі; пандэмія COVID-19 як каталізатар недаверу; рост анлайн-мабілізацыі; знешняя ізаляцыя (адмова ад назіральнікаў АБСЕ); маральнае знясіленне рэжыму; сацыяльны выбух назапашанага расколу (горад/сяло, пакаленні). |
| 2022 (Дэпалітызацыя і фаталізм) | Нізкая цікавасць да рэферэндуму; "шэрая зона" 40-50% (цяжка адказаць); удзел рытуальны (40% плануюць, але без сэнсу); адсутнасць эмацыйнага ўцягвання; адмова ад палітычнай актыўнасці (моладзь ігнаруе); скептыцызм да змен (большасць не бачыць сэнсу ў рэформе). | Вайна ва Украіне (шок, страх, "асаднае становішча"); пост-2020 рэпрэсіі (арышты, знішчэнне НДА/партый); татальны кантроль і цэнзура; страта суб'ектнасці (вывучаная бездапаможнасць); знешняя залежнасць ад Расіі; траўма ад пратэстаў 2020-2021. |

| ПЕРЫЯД | КЛЮЧАВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ Ў ЭЛЕКТАРАЛЬНЫХ ПАВОДЗІНАХ | ФАКТАРЫ ЎПЛЫВУ |
|---|---|---|
| 2025 (Нармалізацыя фаталізму і рытуалізацыя) | Запланаваная яўка ~70%, але нізкая цікавасць (трацiна не сочыць за кампаніяй); матывацыя - "грамадзянскі абавязак" без эмоцый; перадвызначанасць вынікаў (трацiну згодны); эмацыйнае выгаранне (адсутнасць эмоцый дамінуе); лаяльнасць умоўная (40-50% падтрымка стабільнасці, але без разумення ідэй); рост апатыі сярод усіх груп. | Працяглыя рэпрэсіі і эміграцыя актыўных; вайна ва Украіне і ізаляцыя (адсутнасць замежных участкаў, назіральнікаў АБСЕ); новая Канстытуцыя як фармальнасць; эканамічная адаптацыя (кампенсацыйная ілюзія нармальнасці); страта веры ў змены; тэхнакратычная лаяльнасць vs выгаранне. |
| Агульныя тэндэнцыі (2001–2025) | Паступовы пераход ад палярызацыі да апатыі і фаталізму; разрыў самасправаздач і афіцыйных вынікаў (падтрымка Лукашэнкі завышаная на 20-40%); рост "шэрай зоны" (самацэнзура); рытуалізацыя ўдзелу; дэмаграфічны раскол (моладзь/горад крытычны, пажылыя/сяло лаяльней, але слабее пасля 2020); зніжэнне даверу да інстытутаў (з 50% у 2006 да калапсу ў 2020). | Рэпрэсіі і страх (узмацненне пасля 2020); прапаганда і цэнзура (дамінаванне дзяржСМІ, пераход да інтэрнэту); эканамічныя фактары (стабільнасць як аснова лаяльнасці, крызісы як каталізатар недаверу); знешнія падзеі (войны, санкцыі, залежнасць ад РФ); адміністрацыйныя маніпуляцыі (датэрміновае галасаванне, адсутнасць альтэрнатывы); траўма і вывучаная бездапаможнасць як доўгатэрміновы эфект. |

# ВЫСНОВЫ

2001–2006 гады — ключавы перыяд інстытуцыяналізацыі аўтарытарнага рэжыму.

У 2001 годзе адбыліся першыя прэзідэнцкія перавыбары пасля крызісу 1990-х, адбываецца легітымацыя ўлады на хвалі настальгіі па стабільнасці. Рэферэндум 2004 года скасоўвае абмежаванне прэзідэнцкіх тэрмінаў, разбурае баланс уладаў. Трэці прэзідэнцкі мандат у 2006 годзе замацаваў персаналісцкую мадэль, якая падаўляе пратэстную мабілізацыю.

Пры гэтым у 2001 годзе палова насельніцтва лічыць, што нічога не залежыць ад асобнага чалавека, людзі ўдзельнічаюць у выбарах рытуальна, у пошуку “стабільнасці”, а палітычная суб’ектнасць мінімальная. Да 2004 года фарміруецца грамадскі фаталізм: большасць успрымае ўладу як нязменную. Грамадства падзяляецца на лаяльную большасць і маўклівую меншасць: гэта становіцца прыкметна па высокіх працэнтах адмоў ад адказаў на пытанні. Да сярэдзіны 2000-х апатыя становіцца масавым механізмам лаяльнасці: “хай будзе, абы не горш”. Назіраецца нармалізацыя не дэмакратычных практык — маніпуляцыі з датэрміновым галасаваннем, ціск на працаўнікоў, панаванне прапаганды. Легітымнасць фарміруецца праз стомленасць і страх, а не давер і ўдзел.

Да гэтага часу ў беларускім грамадстве ўжо існуюць два палітычныя светы, якія жывуць паралельна:

- Лаялісцкая Беларусь (“стабільнасць”, “мір”, “адсутнасць алігархаў”), якая падтрымлівае патэрналізм і дзяржаўны кантроль, даврае тэлебачанню і ўладзе і прадстаўлена ў першую чаргу жыхарамі сельскай мясцовасці, старэйшым узростам, дзяржаўнымі службоўцамі.

- Альтэрнатыўная Беларусь (“перамены”, “годнасць”, “свабода”), якая падтрымлівае грамадзянскую актыўнасць і індывідуальную адказнасць, дыстанцуецца ад афіцыйнай інфармацыі і прадстаўлена гарадскім насельніцтвам, моладдзю, высокаадукаванымі кантынгентамі.

Гэты раскол не пераходзіў у адкрытую палітычную канфрантацыю праз страх. Але ён стаў глыбокім культурным і ідэнтыфікацыйным фактарам: раскол не разбурыў рэжым, але стварыў латэнтнае напружанне ў краіне.

Гэты раскол праяўляў сябе на трох узроўнях:

1. Сацыяльным — паміж пакаленнямі, горадам і вёскай, бюджэтнікамі і прыватным сектарам.

2. Культурным — паміж арыентацыяй на стабільнасць і на свабоду.

3. Псіхалагічным — паміж унутранай нязгодай і знешняй лаяльнасцю.

Да 2015 года закрываецца цыкл станаўлення аўтарытарнай стабільнасці. Раскол становіцца нормай, убудаванай у палітычную культуру. Рэжым умацоўваецца настолькі, што пераходзіць ад этапу станаўлення да этапу амаль поўнай інстытуцыяналізацыі і руціннасці. Палітычны ўдзел рытуалізуецца, падтрымка дзеючай улады становіцца функцыянальнай, а не ідэалагічнай. Легітымнасць будуецца на страху і адсутнасці альтэрнатыў. Расце самацэнзура — прыкмета страху, недаверу і схаванага напружання.

Нарастае эрозія падтрымкі: замест лаяльнасці прыходзіць апатыя. Тут асабліва паказальныя дадзеныя даследаванняў: упершыню рэжым атрымлівае не рост, а падзенне даверу ў самаспраўздачах. Гэта азначае, што сістэма пачынае дасягаць мяжы ўстойлівасці, падтрымка ўлады стабілізуецца на механічным узроўні. Дадаткова да гэтага дадаюцца магчымасці альтэрнатыўнага медыяспажывання і ўзрастаючая роля Інтэрнэту.

Замарожаны канфлікт, не бачны звонку, але структурна глыбокі, прыводзіць да крызісу, калі ў 2020 годзе:

Знікае страх і з’яўляецца масавае пачуццё несправядлівасці.

Адбываецца беспрэцэдэнтная мабілізацыя (у тым ліку і ў выніку няздольнасці ўлады супрацьстаяць пандэміі), якую не магчыма было прадказаць па афіцыйных дадзеных, але якую вельмі ясна відаць у перадумовах пасля 2015 года. Усе схаваныя лініі расколу 2001–2015 гадоў становяцца яўнымі, вулічнымі і масавымі. Рэжым губляе палітычную, маральную і электаральную легітымнасць — утрыманне ўлады магчымае толькі праз рэпрэсіі. Такім чынам, усе выбарчыя перыяды — гэта не асобныя эпохі палітычнай гісторыі Беларусі, а адзіны працэс

накаплення расколу, які завяршыўся палітычным выбухам. 2020 год не з'яўляецца палітычнай анамаліяй, а становіцца лагічным фіналам усёй гісторыі станаўлення гвалтоўнай аўтакратыі.

Рэферэндум 2022 — кропка пераходу ад "страхавага" аўтарытарызму да палітычнага фаталізму, які да 2025 года стаў дамінуючым. У гэты час Беларусь — гэта грамадства, у якім людзі баяцца казаць, не вераць у сэнс палітыкі, пазбягаюць адзнак, не бачаць будучыні і ўспрымаюць рэферэндум як бессэнсоўную руціну. Гэта і ёсць момант нараджэння масавага палітычнага фаталізму, які вызначае ўсё далейшае развіццё да 2025 года.

У 2025 годзе ва ўмовах, калі сотні тысяч людзей пакінулі краіну, знішчаны апазіцыя, не залежныя медыя і НДА, большасць палітычна актыўных жыхароў знаходзіцца пад ціскам, мы маем справу з новым, інстытуцыйна замацаваным этапам аўтарытарнай эвалюцыі. Гэта не азначае адсутнасць расколу, але яго пераход у новую фазу: не паміж уладай і апазіцыяй, а паміж унутрана выгарэлымі і адхіленымі (дэпрываванымі), з аднаго боку, і тэхнакратычна-лаяльнымі, з другога.

Прычым нават лаяльнасць вельмі ўмоўная, паколькі мы маем справу са станам масавай свядомасці, у якой грамадства губляе ўяўленне аб уласнай палітычнай суб'ектнасці і ўспрымае палітычны парадак як нязменны і наканаваны, што вядзе да рытуальнага, адаптыўнага ўдзелу і эмацыйнай адхіленасці. У існуючых умовах палітычнага фаталізму палітычны ўдзел цалкам ператвараецца ў рытуал, з'яўляецца эмацыйная абясцэненасць і здранцвенне. Нормы ўдзелу застаюцца, але без зместу, людзі пераходзяць да індывідуальных стратэгій выжывання. Сама ідэя палітыкі знікае, замяняючыся чаканнем, што "нічога ад нас не залежыць і так будзе заўсёды".

У выніку мы можам вылучыць чатыры рэжымы палітычнага ўдзелу і, адпаведна, чатыры палітычныя станы грамадства, якія вызначаюцца эвалюцыяй электаральных паводзін у Беларусі з 2001 года.

Першы этап (2001-2006) — рэжым палярызаванай лаяльнасці — палітычны дыскурс функцыянуе ў логіцы "ўлада супраць апазіцыі", апошняя мае бачную інфраструктуру: партыі, СМІ, назіранне за выбарамі. Палітычныя кампаніі даволі жорсткія, але выбарнасць улады ўсё яшчэ на парадку дня. Адпаведна, насельніцтва цікавіцца выбарамі, ёсць палярызацыя па лініі сторонікі-праціўнікі ўлады, людзі адчуваюць надзею, што іх голас не шта мяняе. Гэта перыяд класічнага аўтарытарнага спаборніцтва — без дэмакратыі, але з элементамі канкурэнцыі і мабілізацыі.

Другі этап (2010-2015) — рэжым кансервацыі і рэзігнацыі — пасля пацыфікацыі пратэстаў 2010 года ўзмацніўся страх, эканамічная не стабільнасць і крызісы прывялі да фарміравання ў грамадстве прагматычнай устаноўкі "абы не горш". Цікавасць да выбараў падае, людзі галасуюць па звычцы, "з пачуцця абавязку", а не з надзеі на змены. Эканамічная матывацыя выходзіць на першы плян. Але ўсё яшчэ захоўваецца палітычнае пачуццё рэальнасці — усведамленне, што выбары маглі б мець значэнне, калі б сістэма была іншай.

Трэці этап (2020-2021) — выбух палітычнай суб'ектнасці і наступны яе злом — нявер'е ў афіцыйныя вынікі справакавала з'яўленне мільёнаў уцягнутых і вярнула ідэю аб магчымасці ўплыву, разбурыўшы ранейшы "сацыяльны кантракт". Але далей быў адказ рэжыму: масавыя рэпрэсіі, крыміналізацыя любой не санкцыянаванай актыўнасці, поўнае разбурэнне ўсіх інфраструктур апазіцыі і знішчэнне публічнай палітычнай прасторы. Гэты перыяд стаў палітычнай траўмай нацыі, кульмінацыяй надзеі і яе крушэння і вызначыў разрыў, які стаў галоўнай крыніцай трансфармацыі палітычнай свядомасці.

Чацвёрты этап (2022-2025) — рэжым палітычнага фаталізму — пасля поўнага краху палітычных чаканняў знікае сама ідэя выбараў, на фоне вайны страх становіцца нормай, адбываецца рытуалізацыя палітычнай дзейнасці пры адсутнасці сэнсу. Вынікам стаў 2025 год, які канчаткова нармалізаваў фаталізм: выбары — цалкам механічны працэс, людзі не ўдзельнічаюць эмацыйна, зноў матывацыя — гэта "пачуццё абавязку" пры адсутнасці цікавасці і разуменні сэнсу.

Выбары перасталі быць нават сімвалічным інструментам выбару і сталі рытуальнай практыкай падтрымання механізма ўлады. Раскол застаецца, але ён больш не палітычны — паміж рэальнымі палітычнымі суб'ектамі як улада і апазіцыя, а псіхасацыяльны — паміж тымі, хто дэманструе тэхнакратычную лаяльнасць (адміністрацыйнае ядро), і тымі, хто папросту эмацыйна выгарэў і спустошаны (большасць).

У грамадскай думцы апісаныя працэсы адлюстроўваюцца праз феномен "спіралі маўчання": адной з галоўных тэндэнцый з'яўляецца рост "шэрай зоны" — долі рэспандэнтаў, якія адмаўляюцца адказваць на пытанні ці выбіраюць сацыяльна ўхваленыя адказы з-за страху. Ужо ў 2001 годзе рэальная падтрымка ўлады па апытаннях была значна ніжэйшай за афіцыйныя вынікі. Да 2025 года страх трансфармаваўся: людзі альбо пазбягаюць удзелу ў апытаннях, альбо дэкларуюць лаяльнасць, каб засцерагчы сябе ад сябе. Гэта стварае

ілюзію “кансалідацыі”, якая на справе з’яўляецца формай адаптыўнага выжывання.

Беларусь прыйшла да стану “застылага грамадства”: яно знаходзіцца ў стане глыбокай траўмы і атамізацыі. Палітычнае поле зачышчана, альтэрнатывы адсутнічаюць не толькі ў бюлетэнях, але і ў публічным дыскурсе ўнутры краіны. Аднак пад знешнім пластом “стабільнасці” і “фаталізму” хаваецца фундаментальная праблема: легітымнасць улады трымаецца выключна на сілавым рэсурсе і адсутнасці бачнай альтэрнатывы, а не на даверы ці “народнай любові”, як гэта было ў раннія 2000-я.

# ДАДАТКІ

Табліца 2001.01 Ці прымалі Вы ўдзел у выбарах? (%)

| | TOTAL | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 85,6 | 82,6 | 80,2 | 86,5 | 86,4 | 88,8 | 90,9 |
| Не | 13,6 | 17,4 | 19,1 | 11,3 | 12,9 | 11,2 | 8,1 |
| Няма адказу | 0,8 | 0,0 | 0,8 | 2,3 | 0,7 | 0,0 | 1,0 |

Табліца 2001.02 Калі Вы ўдзельнічалі ў выбарах, то калі галасавалі? (%)

| | TOTAL | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Галасаваў(ла) датэрмінова | 18,3 | 14,0 | 13,7 | 21,8 | 17,0 | 20,2 | 25,3 |
| Галасаваў(ла) 9 верасня | 63,8 | 66,9 | 65,6 | 62,4 | 65,3 | 59,6 | 60,6 |
| Няма адказу | 17,9 | 19,0 | 20,6 | 15,8 | 17,7 | 20,2 | 14,1 |

Табліца 2001.03 Маглі б Вы сказаць, чыя перадвыбарчая праграма Вам найбольш спадабалася? (%)

| | СПАДАБАЛАСЯ | НЕ СПАДАБАЛАСЯ | НЕ ЗНАЁМЫ З ПРАГРАМАЙ | НЯМА АДКАЗУ |
|---|---|---|---|---|
| Лукашэнка | 44,3 | 15,7 | 24,6 | 15,4 |
| Ганчарыка | 13,3 | 27,1 | 34,0 | 25,6 |
| Гайдукевіча | 4,3 | 28,2 | 39,0 | 28,5 |

Табліца 2001.04 Ці не было падчас выбарчай кампаніі (уключаючы і дзень галасавання) якіх-небудзь парушэнняў у дачыненні да Вас асабіста?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65+ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Не | 88,2 | 87,3 | 88,9 | 81,8 | 87,0 | 91,0 | 84,4 | 94,4 | 93,9 |
| Былі | 4,4 | 4,2 | 4,6 | 7,4 | 3,8 | 3,0 | 7,5 | 1,1 | 2,0 |
| Няма адказу | 7,4 | 8,5 | 6,4 | 10,7 | 9,2 | 6,0 | 8,2 | 4,5 | 4,0 |

Табліца 2006.01 У сакавіку адбыліся выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ці прымалі Вы ў іх удзел?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) датэрмінова (14-18 сакавіка) | 32,4 | 28,5 | 35,7 | 26,4 | 29,4 | 29,9 | 34,4 | 38,5 | 37,3 |
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) у дзень выбараў 19 сакавіка | 59,5 | 62,6 | 57,0 | 58,0 | 60,0 | 63,3 | 58,6 | 56,0 | 59,5 |
| Не, не прымаў(ла) удзелу | 8,0 | 8,9 | 7,3 | 15,6 | 10,5 | 6,8 | 7,0 | 5,5 | 3,3 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) датэрмінова (14-18 сакавіка) | 32,4 | 23,9 | 30,1 | 44,7 | 37,5 | 18,4 | 37,1 | 38,8 | 29,9 | 38,1 |
| Так, прымаў(ла) і галасаваў(ла) у дзень выбараў 19 сакавіка | 59,5 | 69,8 | 62,6 | 49,5 | 57,8 | 67,8 | 55,2 | 51,6 | 61,0 | 56,2 |
| Не, не прымаў(ла) удзелу | 8,0 | 6,2 | 7,3 | 5,8 | 4,7 | 13,8 | 7,7 | 9,5 | 9,1 | 5,8 |

Табліца 2006.02 Ці маглі б Вы адказаць, як Вы прагаласавалі?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| За Гайдукевіча С. | 1,1 | 1,1 | 1,0 | 0,8 | 1,9 | 1,2 | 0,8 | 1,2 | 0,6 |
| За Казуліна А. | 0,8 | 1,3 | 0,5 | 0,7 | 1,6 | 0,9 | 1,1 | 0,3 | 0,0 |
| За Лукашенка А. | 62,6 | 55,9 | 68,0 | 42,5 | 50,5 | 59,3 | 61,1 | 75,9 | 87,9 |
| За Мілінкевіча А. | 6,0 | 8,0 | 4,4 | 10,8 | 6,8 | 6,3 | 6,2 | 3,9 | 2,2 |
| Супраць усіх | 3,4 | 3,8 | 3,0 | 5,7 | 4,3 | 3,6 | 4,1 | 1,8 | 0,4 |
| Не хочу адказваць | 26,1 | 29,8 | 23,1 | 39,6 | 34,9 | 28,6 | 26,6 | 16,8 | 8,9 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| За Гайдукевіча С. | 1,1 | 0,3 | 0,4 | 0,3 | 0,4 | 1,9 | 3,4 | 0,4 | 1,0 | 1,3 |
| За Казуліна А. | 0,8 | 0,2 | 0,3 | 0,3 | 1,1 | 1,5 | 2,3 | 0,0 | 0,8 | 0,9 |
| За Лукашенка А. | 62,6 | 69,7 | 70,9 | 69,0 | 71,2 | 40,3 | 54,0 | 70,2 | 57,3 | 74,2 |
| За Мілінкевіча А. | 6,0 | 6,2 | 2,1 | 4,2 | 3,9 | 14,2 | 6,2 | 2,6 | 7,2 | 3,5 |
| Супраць усіх | 3,4 | 4,0 | 2,7 | 3,1 | 2,5 | 5,3 | 3,2 | 2,0 | 3,9 | 2,1 |
| Не хочу адказваць | 26,1 | 19,6 | 23,6 | 23,1 | 20,9 | 36,8 | 30,8 | 24,9 | 29,8 | 18,0 |

Табліца 2006.03 А як Вам здаецца, у якой меры можна давяраць вынікам праведзеных прэзідэнцкіх выбараў?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Думаю, што вынікі выбараў дакладныя, ім можна давяраць | 51,3 | 47,1 | 54,7 | 39,3 | 41,6 | 43,5 | 45,9 | 60,6 | 78,7 |
| Нейкія парушэнні | 24,7 | 25,1 | 24,3 | 27,9 | 27,4 | 29,1 | 28,2 | 22,9 | 12,3 |
| Істотныя парушэнні | 11,4 | 14,7 | 8,6 | 19,4 | 16,0 | 11,6 | 11,0 | 7,0 | 3,1 |
| Цяжка адказаць | 12,7 | 13,1 | 12,4 | 13,5 | 15,0 | 15,9 | 14,9 | 9,5 | 5,9 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Думаю, што вынікі выбараў дакладныя, ім можна давяраць | 51,3 | 0,3 | 0,4 | 0,3 | 0,4 | 1,9 | 3,4 | 0,4 | 1,0 | 1,3 |
| Нейкія парушэнні | 24,7 | 0,2 | 0,3 | 0,3 | 1,1 | 1,5 | 2,3 | 0,0 | 0,8 | 0,9 |
| Істотныя парушэнні | 11,4 | 69,7 | 70,9 | 69,0 | 71,2 | 40,3 | 54,0 | 70,2 | 57,3 | 74,2 |
| Цяжка адказаць | 12,7 | 6,2 | 2,1 | 4,2 | 3,9 | 14,2 | 6,2 | 2,6 | 7,2 | 3,5 |

Табліца 2015.01 Ці адпавядае дзейнасць цяперашняга Прэзідэнта інтарэсам такіх людзей, як Вы?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 25,2 | 20,7 | 29,0 | 17,6 | 18,3 | 20,0 | 20,8 | 28,9 | 48,2 |
| Хутчэй так | 36,1 | 34,5 | 37,4 | 36,7 | 31,4 | 31,8 | 43,2 | 39,1 | 35,6 |
| Хутчэй не | 14,3 | 18,3 | 10,9 | 15,5 | 21,2 | 20,1 | 14,3 | 8,3 | 4,0 |
| Не | 6,3 | 8,2 | 4,8 | 6,8 | 8,9 | 6,8 | 4,8 | 6,2 | 3,8 |
| Цяжка адказаць | 18,1 | 18,3 | 17,9 | 23,4 | 20,2 | 21,3 | 16,9 | 17,5 | 8,5 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 25,2 | 41,2 | 5,2 | 37,7 | 26,6 | 12,2 | 33,7 | 20,0 | 22,3 | 33,5 |
| Хутчэй так | 36,1 | 34,9 | 20,3 | 46,1 | 35,1 | 38,6 | 37,8 | 37,3 | 37,3 | 32,8 |
| Хутчэй не | 14,3 | 10,8 | 30,1 | 4,2 | 12,0 | 16,9 | 13,7 | 12,7 | 13,8 | 15,6 |
| Не | 6,3 | 4,9 | 8,5 | 1,5 | 3,7 | 11,2 | 6,8 | 6,2 | 7,0 | 4,4 |
| Цяжка адказаць | 18,1 | 8,3 | 35,8 | 10,5 | 22,7 | 21,1 | 8,1 | 23,8 | 19,6 | 13,8 |

Табліца 2015.02 Калі казаць у цэлым, у дзейнасці дзеючага Прэзідэнта было больш дасягненняў ці няўдач?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дасягненняў | 42,1 | 36,9 | 46,5 | 35,8 | 34,9 | 35,3 | 41,3 | 45,0 | 62,9 |
| Няўдач | 4,7 | 5,9 | 3,7 | 7,0 | 5,2 | 4,0 | 4,5 | 3,8 | 3,6 |
| Прыкладна пароўну і таго, і іншага | 34,1 | 36,2 | 32,2 | 30,2 | 36,8 | 42,1 | 36,9 | 34,0 | 22,1 |
| Цяжка адказаць | 19,2 | 21,1 | 17,6 | 26,9 | 23,1 | 18,6 | 17,3 | 17,2 | 11,4 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дасягненняў | 42,1 | 56,2 | 15,0 | 58,3 | 55,8 | 27,9 | 41,2 | 44,5 | 40,2 | 47,5 |
| Няўдач | 4,7 | 1,5 | 9,3 | 1,6 | 4,0 | 9,2 | 2,3 | 3,9 | 5,5 | 2,4 |
| Прыкладна пароўну і таго, і іншага | 34,1 | 26,9 | 44,0 | 22,8 | 27,5 | 40,9 | 40,3 | 33,8 | 35,0 | 31,5 |
| Цяжка адказаць | 19,2 | 15,4 | 31,7 | 17,4 | 12,7 | 22,0 | 16,2 | 17,8 | 19,4 | 18,6 |

Табліца 2015.03 Наколькі Вы згодны са сцвярджэннем пра тое, што пад кіраўніцтвам цяперашняга Кіраўніка дзяржавы Беларусь у цэлым развіваецца ў правільным кірунку?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Цалкам згодзен(а) | 25,3 | 21,8 | 28,3 | 15,0 | 16,8 | 22,2 | 24,7 | 29,8 | 45,8 |
| Хутчэй згодзен(а) | 41,1 | 39,6 | 42,3 | 46,4 | 39,4 | 40,5 | 44,0 | 39,2 | 37,4 |
| Хутчэй не згодзен(а) | 14,6 | 17,0 | 12,6 | 19,3 | 19,4 | 17,2 | 14,0 | 11,5 | 5,1 |
| Не згодны(а) | 3,5 | 5,2 | 2,1 | 4,8 | 4,5 | 4,6 | 2,3 | 2,9 | 1,6 |
| Цяжка адказаць | 15,5 | 16,5 | 14,6 | 14,5 | 19,9 | 15,5 | 15,0 | 16,7 | 10,0 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Цалкам згодзен(а) | 25,3 | 44,6 | 4,0 | 44,4 | 22,5 | 10,2 | 32,9 | 17,9 | 21,5 | 36,4 |
| Хутчэй згодзен(а) | 41,1 | 38,3 | 33,3 | 37,0 | 44,8 | 46,7 | 43,4 | 43,0 | 42,3 | 37,5 |
| Хутчэй не згодзен(а) | 14,6 | 9,0 | 38,6 | 7,3 | 5,6 | 18,1 | 11,7 | 10,9 | 16,1 | 10,4 |
| Не згодны(а) | 3,5 | 1,2 | 3,9 | 2,5 | 4,3 | 6,3 | 3,1 | 2,5 | 3,6 | 3,1 |
| Цяжка адказаць | 15,5 | 7,0 | 20,2 | 8,8 | 22,8 | 18,7 | 9,0 | 25,7 | 16,5 | 12,6 |

Табліца 2015.04 Ці ведаеце Вы пра тое, што 11 кастрычніка 2015 года пройдуць выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, ведаю | 95,5 | 94,6 | 96,3 | 95,1 | 94,6 | 95,7 | 97,5 | 95,1 | 95,4 |
| Нешта чуў пра гэта | 3,4 | 4,2 | 2,7 | 3,9 | 5,4 | 2,7 | 1,8 | 3,1 | 3,0 |
| Не, не ведаю ці не хачу адказваць | 1,1 | 1,2 | 0,9 | 1,0 | 0,0 | 1,6 | 0,6 | 1,8 | 1,5 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, ведаю | 95,5 | 98,6 | 93,7 | 94,2 | 98,6 | 94,3 | 94,4 | 96,1 | 96,1 | 93,8 |
| Нешта чуў пра гэта | 3,4 | 1,4 | 5,4 | 3,6 | 0,0 | 3,7 | 5,1 | 3,9 | 2,9 | 4,8 |
| Не, не ведаю ці не хачу адказваць | 1,1 | 0,0 | 0,8 | 2,2 | 1,4 | 2,0 | 0,5 | 0,0 | 0,9 | 1,4 |

Табліца 2015.05 Ці плануеце Вы прыняць удзел у маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах (у галасаванні)?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 64,0 | 59,7 | 67,7 | 47,6 | 57,4 | 63,6 | 69,2 | 72,6 | 74,4 |
| Хутчэй так | 18,0 | 18,2 | 17,9 | 23,3 | 18,8 | 18,7 | 19,1 | 15,2 | 13,0 |
| Хутчэй не | 3,6 | 4,7 | 2,6 | 5,9 | 5,3 | 3,3 | 3,0 | 1,9 | 1,9 |
| Не | 4,4 | 5,5 | 3,5 | 7,2 | 6,6 | 4,7 | 1,9 | 3,6 | 2,2 |
| Яшчэ не ведаю | 7,7 | 9,0 | 6,7 | 11,3 | 9,4 | 9,0 | 4,9 | 6,0 | 5,7 |
| Не хацеў бы адказваць на гэтае пытанне | 2,2 | 2,9 | 1,6 | 4,7 | 2,5 | 0,8 | 1,8 | 0,8 | 2,8 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 64,0 | 82,2 | 59,9 | 67,1 | 63,8 | 47,9 | 68,5 | 62,5 | 62,3 | 69,1 |
| Хутчэй так | 18,0 | 5,0 | 24,0 | 19,7 | 18,5 | 18,2 | 19,4 | 22,9 | 18,3 | 17,3 |
| Хутчэй не | 3,6 | 2,5 | 3,5 | 2,2 | 3,0 | 6,8 | 3,5 | 2,3 | 3,9 | 2,7 |
| Не | 4,4 | 1,8 | 1,3 | 2,0 | 2,1 | 12,4 | 3,3 | 5,2 | 5,1 | 2,5 |
| Яшчэ не ведаю | 7,7 | 4,9 | 9,8 | 4,8 | 12,6 | 11,8 | 3,9 | 6,6 | 8,4 | 5,9 |
| Не хацеў бы адказваць на гэтае пытанне | 2,2 | 3,5 | 1,5 | 4,2 | 0,0 | 2,9 | 1,4 | 0,6 | 2,1 | 2,4 |

Табліца 2015.06 Калі Вы збіраецеся прагаласаваць?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У дзень выбараў | 51,2 | 47,6 | 54,2 | 44,1 | 44,5 | 46,7 | 58,1 | 55,9 | 59,3 |
| Датэрмінова | 8,8 | 8,0 | 9,5 | 3,9 | 8,7 | 9,5 | 8,9 | 13,2 | 8,2 |
| Яшчэ не вырашыў(ла) | 18,4 | 19,0 | 18,0 | 20,5 | 18,8 | 22,1 | 17,2 | 15,2 | 16,6 |
| Цяжка адказаць | 21,6 | 25,4 | 18,3 | 31,6 | 27,9 | 21,7 | 15,9 | 15,6 | 15,9 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У дзень выбараў | 51,2 | 49,0 | 47,3 | 45,1 | 62,0 | 55,5 | 55,4 | 43,6 | 51,7 | 49,6 |
| Датэрмінова | 8,8 | 14,8 | 8,7 | 9,8 | 4,7 | 1,5 | 11,9 | 12,0 | 7,6 | 12,3 |
| Яшчэ не вырашыў(ла) | 18,4 | 21,0 | 25,4 | 23,8 | 13,6 | 5,3 | 17,5 | 27,2 | 18,0 | 19,5 |
| Цяжка адказаць | 21,6 | 15,2 | 18,6 | 21,3 | 19,7 | 37,7 | 15,3 | 17,3 | 22,6 | 18,6 |

Табліца 2015.07 Як Вы ставіцеся да датэрміновага галасавання?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Станоўча | 31,3 | 31,3 | 28,9 | 33,2 | 26,8 | 27,0 | 29,8 | 28,7 | 36,2 |
| Хутчэй станоўча | 17,2 | 17,2 | 14,6 | 19,4 | 12,2 | 16,8 | 16,0 | 21,1 | 18,4 |
| Абыякава | 30,1 | 30,1 | 32,2 | 28,4 | 37,1 | 33,6 | 33,3 | 26,6 | 25,2 |
| Хутчэй адмоўна | 6,1 | 6,1 | 6,4 | 5,9 | 7,1 | 6,0 | 6,4 | 6,8 | 6,7 |
| Адмоўна | 8,4 | 8,4 | 10,9 | 6,2 | 10,4 | 9,5 | 8,1 | 8,4 | 6,4 |
| Цяжка адказаць | 6,9 | 7,0 | 6,8 | 6,4 | 7,1 | 6,4 | 8,6 | 7,1 | 5,7 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Станоўча | 31,3 | 43,5 | 15,5 | 32,4 | 43,5 | 18,8 | 34,5 | 36,3 | 28,7 | 38,4 |
| Хутчэй станоўча | 17,2 | 13,2 | 16,5 | 23,9 | 9,1 | 16,4 | 18,4 | 21,9 | 18,1 | 14,6 |
| Абыякава | 30,1 | 22,8 | 38,9 | 29,1 | 31,1 | 31,0 | 28,9 | 29,8 | 29,5 | 31,7 |
| Хутчэй адмоўна | 6,1 | 5,6 | 9,1 | 2,9 | 5,1 | 9,7 | 6,1 | 2,8 | 6,9 | 4,1 |
| Адмоўна | 8,4 | 9,7 | 3,7 | 5,8 | 10,2 | 17,4 | 7,3 | 0,6 | 9,5 | 5,1 |
| Цяжка адказаць | 6,9 | 5,1 | 16,3 | 5,9 | 1,0 | 6,6 | 4,9 | 8,5 | 7,2 | 6,0 |

Табліца 2015.08 Скажыце, калі ласка, чаму Вы збіраецеся ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Няма адказу | 18,5 | 22,4 | 15,2 | 29,0 | 24,2 | 17,7 | 12,1 | 14,2 | 13,1 |
| Каб выказаць сваё меркаванне, стаўленне да сітуацыі ў краіне | 27,1 | 27,8 | 26,5 | 30,0 | 24,0 | 32,4 | 27,9 | 28,9 | 19,3 |
| Гэта грамадзянскі абавязак кожнага | 52,4 | 49,2 | 55,0 | 42,4 | 46,6 | 46,7 | 62,0 | 56,3 | 61,1 |
| Каб выказаць свой недавер дзейнай уладзе | 0,7 | 0,5 | 0,8 | 1,0 | 0,6 | 0,5 | 0,8 | 0,2 | 1,0 |
| Бо ў выбарах будуць удзельнічаць большасць маіх блізкіх, знаёмых. | 2,9 | 3,0 | 2,7 | 2,0 | 2,6 | 3,2 | 3,2 | 2,4 | 3,6 |
| Бо выбары даюць рэальную магчымасць удзельнічаць у жыцці краіны, ва ўпраўленні справамі дзяржавы. | 12,1 | 11,7 | 12,5 | 8,2 | 9,6 | 15,1 | 13,6 | 15,4 | 11,0 |
| Асаблівых прычын няма, але я ўсё роўна пайду галасаваць | 11,7 | 10,6 | 12,7 | 12,6 | 13,2 | 11,3 | 9,9 | 8,3 | 15,1 |
| Іншае | 0,4 | 0,3 | 0,4 | 0,9 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,3 | 0,8 |
| Асаблівых прычын няма, але я ўсё роўна пайду галасаваць | 19,0 | 23,9 | 14,9 | 29,4 | 25,1 | 19,7 | 13,3 | 13,2 | 12,9 |

Табліца 2015.08 Скажыце, калі ласка, чаму Вы збіраецеся ўдзельнічаць у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Няма адказу | 18,5 | 12,8 | 16,5 | 13,6 | 17,7 | 34,8 | 13,6 | 14,9 | 20,1 | 13,8 |
| Каб выказаць сваё меркаванне, стаўленне да сітуацыі ў краіне | 27,1 | 25,0 | 30,1 | 30,1 | 17,3 | 21,3 | 31,8 | 35,0 | 29,6 | 20,0 |
| Гэта грамадзянскі абавязак кожнага | 52,4 | 61,5 | 45,5 | 60,9 | 38,9 | 47,3 | 57,6 | 51,9 | 50,2 | 58,4 |
| Каб выказаць свой недавер дзейнай уладзе | 0,7 | 0,3 | 1,0 | 0,9 | 0,0 | 1,0 | 0,5 | 0,8 | 0,8 | 0,2 |
| Бо ў выбарах будуць удзельнічаць большасць маіх блізкіх, знаёмых. | 2,9 | 0,8 | 5,4 | 2,4 | 4,5 | 0,0 | 5,7 | 2,3 | 2,9 | 2,8 |
| Бо выбары даюць рэальную магчымасць удзельнічаць у жыцці краіны, ва ўпраўленні справамі дзяржавы. | 12,1 | 16,0 | 6,7 | 17,9 | 19,1 | 3,7 | 16,6 | 7,1 | 11,2 | 14,9 |
| Асаблівых прычын няма, але я ўсё роўна пайду галасаваць | 11,7 | 11,9 | 9,4 | 8,7 | 32,2 | 4,5 | 14,8 | 5,8 | 10,4 | 15,3 |
| Іншае | 0,4 | 0,3 | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,9 | 0,6 | 0,0 | 0,5 | 0,0 |
| Асаблівых прычын няма, але я ўсё роўна пайду галасаваць | 19,0 | 13,4 | 16,4 | 14,7 | 17,7 | 34,6 | 14,1 | 17,3 | 20,4 | 14,9 |

Табліца 2015.09 У якой меры Вас цікавяць будучыя выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Цікавяць | 30,3 | 26,5 | 33,4 | 25,7 | 22,2 | 26,8 | 32,9 | 34,2 | 42,0 |
| Большай часткай цікавяць | 30,4 | 31,0 | 29,9 | 25,7 | 30,0 | 28,4 | 30,8 | 33,3 | 34,3 |
| Большай часткай не цікавяць | 22,6 | 25,3 | 20,3 | 26,0 | 27,1 | 28,5 | 20,4 | 18,6 | 13,3 |
| Не цікавяць | 13,4 | 13,4 | 13,5 | 17,5 | 16,8 | 13,2 | 13,4 | 10,8 | 8,3 |
| Цяжка адказаць | 3,3 | 3,8 | 2,9 | 5,1 | 3,8 | 3,1 | 2,5 | 3,2 | 2,0 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Цікавяць | 30,3 | 19,4 | 36,8 | 17,4 | 17,4 | 40,1 | 29,3 | 29,0 | 33,9 | 50,5 |
| Большай часткай цікавяць | 30,4 | 18,8 | 46,1 | 20,7 | 23,9 | 34,9 | 37,0 | 30,4 | 30,5 | 30,5 |
| Большай часткай не цікавяць | 22,6 | 43,2 | 10,4 | 28,5 | 30,8 | 17,6 | 15,3 | 23,0 | 21,5 | 12,4 |
| Не цікавяць | 13,4 | 15,6 | 4,5 | 31,6 | 24,0 | 7,4 | 6,2 | 13,9 | 12,0 | 5,2 |
| Цяжка адказаць | 3,3 | 1,4 | 2,9 | 2,2 | 1,9 | 3,9 | 0,0 | 12,2 | 3,7 | 2,1 |

Табліца 2015.10 Якім чынам Вы пераважна атрымліваеце інфармацыю пра маючыя адбыцца прэзідэнцкія выбары?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Спецыяльна цікаўлюся гэтай тэмай | 26,4 | 25,0 | 27,6 | 18,5 | 21,0 | 25,0 | 30,6 | 28,6 | 35,7 |
| Выпадкова атрымліваю інфармацыю па гэтай тэме | 67,2 | 69,7 | 65,0 | 75,9 | 72,2 | 69,2 | 62,9 | 63,3 | 58,7 |
| Іншае | 3,1 | 2,3 | 3,7 | 1,7 | 3,1 | 3,1 | 3,5 | 4,7 | 2,2 |
| Цяжка адказаць | 3,4 | 2,9 | 3,7 | 3,9 | 3,8 | 2,7 | 3,0 | 3,4 | 3,5 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Спецыяльна цікаўлюся гэтай тэмай | 26,4 | 42,3 | 28,4 | 23,2 | 15,8 | 17,7 | 35,4 | 21,1 | 25,9 | 27,9 |
| Выпадкова атрымліваю інфармацыю па гэтай тэме | 67,2 | 49,6 | 66,7 | 72,2 | 80,1 | 73,6 | 62,7 | 65,9 | 67,8 | 65,5 |
| Іншае | 3,1 | 4,3 | 3,8 | 1,8 | 0,0 | 5,1 | 1,3 | 4,5 | 3,5 | 1,9 |
| Цяжка адказаць | 3,4 | 3,7 | 1,1 | 2,8 | 4,1 | 3,6 | 0,7 | 8,5 | 2,9 | 4,7 |

Табліца 2015.11 Якім інфармацыйным крыніцам аб маючых адбыцца выбарах Вы аддаеце перавагу?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тэлебачанне | 72,8 | 69,8 | 75,3 | 48,5 | 63,0 | 76,2 | 75,2 | 84,7 | 89,9 |
| Радыё | 18,3 | 18,8 | 17,9 | 7,9 | 12,9 | 13,5 | 18,4 | 22,2 | 36,8 |
| Друкаваныя СМІ (газеты, часопісы) | 27,1 | 27,0 | 27,2 | 13,2 | 19,4 | 23,8 | 33,8 | 38,2 | 35,2 |
| Інтэрнэт | 28,0 | 29,3 | 27,0 | 50,3 | 44,7 | 32,2 | 24,2 | 10,1 | 3,8 |
| Рэклама, наглядная агітацыя | 21,2 | 21,8 | 20,6 | 28,8 | 20,8 | 20,0 | 23,4 | 21,7 | 12,5 |
| Гутаркі з калегамі па працы, сябрамі, знаёмымі, сваякамі | 12,1 | 11,5 | 12,7 | 11,3 | 14,2 | 13,0 | 13,4 | 10,7 | 9,4 |
| Іншае | 0,7 | 0,9 | 0,5 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 2,5 | 0,2 |
| Не атрымліваю інфармацыі | 3,0 | 2,6 | 3,3 | 4,4 | 4,4 | 3,0 | 2,7 | 1,4 | 1,9 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Тэлебачанне | 72,8 | 82,3 | 62,9 | 69,1 | 91,2 | 60,3 | 74,2 | 77,3 | 71,3 | 77,2 |
| Радыё | 18,3 | 26,3 | 29,8 | 19,6 | 16,8 | 11,9 | 17,0 | 7,2 | 16,9 | 22,5 |
| Друкаваныя СМІ (газеты, часопісы) | 27,1 | 33,9 | 33,6 | 32,1 | 23,3 | 14,2 | 28,2 | 27,6 | 26,2 | 29,6 |
| Інтэрнэт | 28,0 | 25,1 | 31,2 | 26,8 | 13,3 | 36,9 | 26,4 | 31,9 | 29,7 | 23,4 |
| Рэклама, наглядная агітацыя | 21,2 | 12,9 | 31,8 | 22,5 | 39,2 | 11,5 | 17,2 | 20,9 | 24,0 | 13,2 |
| Гутаркі з калегамі па працы, сябрамі, знаёмымі, сваякамі | 12,1 | 11,1 | 16,9 | 11,4 | 14,4 | 12,0 | 11,7 | 7,4 | 11,2 | 14,7 |
| Іншае | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 0,0 | 0,3 | 1,5 | 0,0 | 2,4 | 0,9 | 0,0 |
| Не атрымліваю інфармацыі | 3,0 | 0,3 | 1,8 | 0,4 | 3,2 | 8,8 | 3,6 | 0,9 | 3,6 | 1,2 |

Табліца 2015.11 Якім інфармацыйным крыніцам аб маючых адбыцца выбарах Вы аддаеце перавагу?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,7 | 1,2 | 0,3 | 1,6 | 0,5 | 0,8 | 1,2 | 0,2 | 0,0 |
| С. Калякін | 0,1 | 0,1 | 0,1 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Т. Караткевіч | 0,9 | 0,8 | 1,0 | 1,7 | 0,8 | 0,6 | 0,9 | 1,2 | 0,3 |
| А. Лябедзька | 0,3 | 0,5 | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 1,0 | 0,0 | 0,3 | 0,5 |
| А. Лукашэнка | 45,4 | 38,0 | 51,7 | 34,5 | 33,6 | 40,7 | 46,5 | 48,9 | 71,5 |
| Ж. Раманоўская | 0,8 | 1,0 | 0,7 | 0,7 | 1,2 | 0,9 | 0,7 | 1,3 | 0,2 |
| В. Цярэшчанка | 0,3 | 0,4 | 0,1 | 0,4 | 0,6 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,3 |
| М. Улаховіч | 0,0 | 0,0 | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Цяжка адказаць | 33,0 | 37,8 | 28,9 | 41,7 | 39,5 | 39,0 | 32,3 | 24,5 | 19,0 |
| Не хацеў бы адказваць на гэтае пытанне | 18,5 | 20,2 | 17,1 | 18,9 | 23,8 | 16,9 | 18,1 | 23,6 | 8,1 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,7 | 0,0 | 2,3 | 0,2 | 0,0 | 0,3 | 0,9 | 1,3 | 0,7 | 0,5 |
| С. Калякін | 0,1 | 0,0 | 0,5 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,1 | 0,0 |
| Т. Караткевіч | 0,9 | 0,3 | 0,7 | 0,7 | 0,9 | 1,6 | 0,4 | 1,5 | 1,1 | 0,4 |
| А. Лябедзька | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,3 | 1,7 | 0,2 | 0,7 |
| А. Лукашэнка | 45,4 | 65,6 | 30,5 | 51,7 | 51,6 | 30,9 | 54,3 | 34,5 | 43,5 | 50,9 |
| Ж. Раманоўская | 0,8 | 0,0 | 1,6 | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 0,8 | 2,7 | 0,9 | 0,7 |
| В. Цярэшчанка | 0,3 | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,7 | 0,3 | 0,4 | 0,3 | 0,2 |
| М. Улаховіч | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 |
| Цяжка адказаць | 33,0 | 22,1 | 38,0 | 20,4 | 34,0 | 52,1 | 27,7 | 32,3 | 35,4 | 26,1 |
| Не хацеў бы адказваць на гэтае пытанне | 18,5 | 12,0 | 26,1 | 26,3 | 13,4 | 13,5 | 15,3 | 24,9 | 17,8 | 20,4 |

Табліца 2015.13 Як Вы думаеце, хто будзе абраны Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь на будучых выбарах?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,3 | 0,4 | 0,2 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,6 |
| С. Калякін | 0,0 | 0,1 | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Т. Караткевіч | 0,4 | 0,7 | 0,2 | 0,6 | 0,7 | 0,8 | 0,5 | 0,0 | 0,0 |
| А. Лябедзька | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| А. Лукашэнка | 82,8 | 80,5 | 84,8 | 80,0 | 80,6 | 82,8 | 85,6 | 81,6 | 86,8 |
| Ж. Раманоўская | 0,2 | 0,2 | 0,2 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,4 | 0,4 | 0,0 |
| В. Цярэшчанка | 0,7 | 0,9 | 0,5 | 0,4 | 0,0 | 0,9 | 0,0 | 1,5 | 1,5 |
| М. Улаховіч | 0,1 | 0,0 | 0,2 | 0,0 | 0,0 | 0,5 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| Цяжка адказаць | 15,4 | 17,2 | 14,0 | 18,0 | 18,1 | 15,1 | 13,3 | 16,6 | 11,2 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| С. Гайдукевіч | 0,3 | 1,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,8 | 0,0 | 1,0 |
| С. Калякін | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,1 |
| Т. Караткевіч | 0,4 | 2,1 | 0,4 | 0,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,4 | 0,6 |
| А. Лябедзька | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 |
| А. Лукашэнка | 82,8 | 87,9 | 87,3 | 71,3 | 97,9 | 83,0 | 82,1 | 72,4 | 84,0 | 79,5 |
| Ж. Раманоўская | 0,2 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,0 | 0,3 | 0,0 |
| В. Цярэшчанка | 0,7 | 0,3 | 0,0 | 4,2 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,1 | 2,5 |
| М. Улаховіч | 0,1 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,0 | 0,6 | 0,0 | 0,0 | 0,3 |
| Цяжка адказаць | 15,4 | 8,2 | 11,5 | 24,3 | 2,1 | 16,3 | 17,3 | 26,5 | 15,3 | 15,9 |

Табліца 2015.14 Як Вам здаецца, ці можна будзе давяраць вынікам будучых прэзідэнцкіх выбараў?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 32,5 | 29,8 | 34,7 | 26,1 | 26,4 | 29,3 | 29,1 | 37,6 | 48,3 |
| Хутчэй так | 30,0 | 31,1 | 29,2 | 30,1 | 30,0 | 30,8 | 34,1 | 28,1 | 26,7 |
| Хутчэй не | 10,8 | 11,8 | 9,9 | 13,1 | 13,1 | 11,1 | 11,3 | 11,5 | 3,9 |
| Не | 5,4 | 7,1 | 3,8 | 6,0 | 7,0 | 6,1 | 5,1 | 4,4 | 3,2 |
| Цяжка адказаць | 21,3 | 20,2 | 22,3 | 24,6 | 23,6 | 22,7 | 20,5 | 18,4 | 17,8 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так | 32,5 | 46,9 | 12,1 | 47,4 | 32,3 | 18,4 | 38,4 | 33,1 | 28,3 | 44,5 |
| Хутчэй так | 30,0 | 25,2 | 26,5 | 35,2 | 23,1 | 30,5 | 35,2 | 32,6 | 30,2 | 29,5 |
| Хутчэй не | 10,8 | 7,2 | 26,5 | 3,9 | 13,0 | 11,6 | 8,8 | 5,4 | 11,7 | 8,3 |
| Не | 5,4 | 5,0 | 6,2 | 2,4 | 5,1 | 9,5 | 4,2 | 3,8 | 5,4 | 5,3 |
| Цяжка адказаць | 21,3 | 15,7 | 28,7 | 11,0 | 26,5 | 29,9 | 13,4 | 25,0 | 24,5 | 12,4 |

Табліца 2015.15 Як Вы лічыце, ці маюць права кандыдаты, якія прайгралі, аспрэчваць вынікі выбараў у выпадку нязгоды з імі?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, але толькі ў парадку, вызначаным заканадаўствам | 45,9 | 45,7 | 46,0 | 37,3 | 50,6 | 50,0 | 50,8 | 48,0 | 36,0 |
| Так, у тым ліку на масавых акцыях, аж да перагляду вынік | 3,1 | 4,0 | 2,4 | 5,1 | 3,0 | 2,8 | 3,7 | 3,0 | 1,4 |
| Не, гэта не мае сэнсу | 24,1 | 25,9 | 22,6 | 30,2 | 26,0 | 22,5 | 21,1 | 20,3 | 24,9 |
| Не, гэта парушае парадак у краіне | 12,3 | 12,3 | 12,2 | 10,7 | 10,5 | 12,0 | 12,3 | 14,0 | 14,5 |
| Іншае | 0,8 | 0,7 | 0,9 | 0,5 | 0,7 | 0,0 | 0,4 | 2,3 | 0,7 |
| Цяжка адказаць | 13,8 | 11,4 | 15,9 | 16,4 | 9,1 | 12,7 | 11,7 | 12,3 | 22,5 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Так, але толькі ў парадку, вызначаным заканадаўствам | 45,9 | 48,0 | 54,8 | 48,8 | 36,5 | 43,2 | 50,8 | 36,4 | 45,1 | 48,0 |
| Так, у тым ліку на масавых акцыях, аж да перагляду вынік | 3,1 | 2,9 | 5,2 | 2,9 | 0,3 | 4,0 | 2,4 | 3,6 | 2,9 | 3,7 |
| Не, гэта не мае сэнсу | 24,1 | 26,8 | 26,1 | 12,8 | 16,9 | 28,3 | 22,9 | 35,3 | 25,3 | 20,7 |
| Не, гэта парушае парадак у краіне | 12,3 | 16,4 | 2,9 | 26,4 | 12,9 | 3,4 | 17,0 | 6,8 | 11,8 | 13,6 |
| Іншае | 0,8 | 0,0 | 0,3 | 0,0 | 0,0 | 3,8 | 0,0 | 0,3 | 1,0 | 0,2 |
| Цяжка адказаць | 13,8 | 5,8 | 10,8 | 9,0 | 33,4 | 17,4 | 7,0 | 17,7 | 13,8 | 13,9 |

Табліца 2015.16. Калі Ваша жыццё пагаршаецца, то як Вы думаеце, хто (што) у гэтым вінаваты, найперш?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Правительство | 36,9 | 37,2 | 36,5 | 43,5 | 39,3 | 32,9 | 37,9 | 41,7 | 25,5 |
| Президент | 18,8 | 21,1 | 16,8 | 25,1 | 18,4 | 19,9 | 20,1 | 18,3 | 11,1 |
| Местная власть | 17,2 | 17,3 | 17,2 | 15,6 | 17,2 | 17,3 | 18,2 | 21,5 | 13,3 |
| Национальный банк | 4,9 | 4,2 | 5,6 | 7,5 | 3,7 | 4,0 | 6,2 | 5,5 | 3,0 |
| Оппозиция | 1,8 | 2,2 | 1,5 | 1,7 | 0,6 | 1,2 | 2,9 | 2,2 | 2,8 |
| Мировой финансовый кризис | 48,7 | 48,0 | 49,3 | 47,7 | 44,7 | 53,4 | 59,1 | 44,2 | 42,1 |
| Руководители предприятий | 7,9 | 8,9 | 7,0 | 8,9 | 8,5 | 7,1 | 9,4 | 7,6 | 5,6 |
| Предприниматели | 0,4 | 0,2 | 0,6 | 1,1 | 0,2 | 0,0 | 0,3 | 0,7 | 0,5 |
| Виноваты мы сами (население) | 21,6 | 21,9 | 21,3 | 25,5 | 24,6 | 23,0 | 17,8 | 21,5 | 16,4 |
| Другое | 2,7 | 2,8 | 2,6 | 2,5 | 2,8 | 2,0 | 2,7 | 3,8 | 2,4 |
| Никто не виноват | 7,1 | 5,2 | 8,7 | 6,5 | 7,1 | 7,1 | 2,8 | 7,4 | 12,1 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Правительство | 36,9 | 23,0 | 79,6 | 31,2 | 23,6 | 41,8 | 22,3 | 35,0 | 39,2 | 30,1 |
| Президент | 18,8 | 8,4 | 50,9 | 16,3 | 10,4 | 22,5 | 8,3 | 13,8 | 19,7 | 16,3 |
| Местная власть | 17,2 | 12,6 | 55,0 | 10,3 | 8,0 | 8,8 | 13,1 | 12,2 | 16,7 | 18,8 |
| Национальный банк | 4,9 | 5,0 | 4,2 | 5,1 | 5,0 | 4,7 | 3,7 | 7,6 | 6,4 | 0,6 |
| Оппозиция | 1,8 | 0,8 | 0,6 | 4,1 | 0,0 | 1,4 | 1,9 | 3,4 | 1,6 | 2,6 |
| Мировой финансовый кризис | 48,7 | 49,9 | 37,3 | 49,1 | 26,4 | 50,6 | 58,8 | 55,1 | 52,1 | 38,6 |
| Руководители предприятий | 7,9 | 13,1 | 10,9 | 8,3 | 5,0 | 2,9 | 6,4 | 8,2 | 7,4 | 9,2 |
| Предприниматели | 0,4 | 0,0 | 0,0 | 0,7 | 0,0 | 0,9 | 0,7 | 0,4 | 0,4 | 0,5 |
| Виноваты мы сами (население) | 21,6 | 27,6 | 10,0 | 22,2 | 6,6 | 34,3 | 19,6 | 18,9 | 21,3 | 22,5 |
| Другое | 2,7 | 4,7 | 1,2 | 1,7 | 0,0 | 4,0 | 2,9 | 2,5 | 2,8 | 2,3 |
| Никто не виноват | 7,1 | 3,2 | 5,3 | 7,3 | 23,3 | 5,4 | 6,4 | 8,1 | 6,3 | 9,3 |

Табліца 2020. 01 Калі Вы прынялі ўдзел у выбарах Прэзідэнта 9 жніўня, то за каго з кандыдатаў Вы аддалі свой голас?

| | TOTAL | МУЖ | ЖАН | 18-24 | 25-34 | 35-44 | 45-54 | 55-65 | 65 + |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзмітрыеў Андрэй | 1,3 | 1,3 | 1,3 | 1,0 | 1,6 | 2,5 | 1,9 | 0,4 | 0,3 |
| Канапацкая Ганна | 0,5 | 0,1 | 0,9 | 0,5 | 0,6 | 0,7 | 0,4 | 0,4 | 0,6 |
| Лукашэнка Аляксандр | 20,9 | 14,6 | 26,0 | 5,6 | 6,5 | 11,9 | 16,5 | 26,0 | 46,6 |
| Ціханаўская Святлана | 33,3 | 37,7 | 29,6 | 52,4 | 45,4 | 39,0 | 35,7 | 22,9 | 17,2 |
| Чэрачэнь Сяргей | 0,4 | 0,0 | 0,7 | 0,5 | 0,3 | 0,0 | 0,9 | 0,0 | 0,6 |
| Супраць усіх | 6,6 | 6,9 | 6,3 | 4,9 | 7,0 | 5,1 | 8,6 | 8,1 | 5,0 |
| Я не галасаваў(ла) | 11,3 | 13,9 | 9,3 | 11,9 | 14,0 | 14,4 | 8,3 | 9,4 | 10,5 |
| Я не хачу адказваць на гэтае пытанне | 25,7 | 25,5 | 25,9 | 23,1 | 24,6 | 26,4 | 27,7 | 32,8 | 19,1 |

| | TOTAL | БРЭСТ. ВОБЛ. | ВІЦЕБ. ВОБЛ. | ГОМ. ВОБЛ. | ГРОД. ВОБЛ. | МІНСК | МІНСК. ВОБЛ. | МАГІЛ. ВОБЛ. | ГОРАД | ВЁСКА |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Дзмітрыеў Андрэй | 1,3 | 0,0 | 0,8 | 4,2 | 2,0 | 1,4 | 0,9 | 0,0 | 1,2 | 1,3 |
| Канапацкая Ганна | 0,5 | 0,0 | 1,2 | 0,0 | 1,2 | 0,4 | 0,7 | 0,0 | 0,5 | 0,5 |
| Лукашэнка Аляксандр | 20,9 | 25,2 | 19,4 | 18,3 | 25,7 | 14,1 | 21,8 | 26,8 | 27,1 | 19,2 |
| Ціханаўская Святлана | 33,3 | 30,6 | 42,1 | 28,2 | 34,2 | 35,4 | 35,4 | 21,3 | 32,0 | 33,6 |
| Чэрачэнь Сяргей | 0,4 | 0,5 | 0,6 | 0,0 | 0,4 | 0,8 | 0,0 | 0,0 | 0,2 | 0,4 |
| Супраць усіх | 6,6 | 6,3 | 5,0 | 9,5 | 4,5 | 9,0 | 4,7 | 6,5 | 5,3 | 6,9 |
| Я не галасаваў(ла) | 11,3 | 15,9 | 8,4 | 8,8 | 7,7 | 15,7 | 9,6 | 11,0 | 8,1 | 12,2 |
| Я не хачу адказваць на гэтае пытанне | 25,7 | 21,5 | 22,5 | 31,1 | 24,2 | 23,2 | 27,0 | 34,3 | 25,5 | 25,8 |

# АЎТАР



## Алена Шкурова

Беларуская сацыялагіня, доктарка сацыялагічных навук. Нарадзілася ў Мінску, зараз працуе ў Польшчы. Спецыяліст па тэорыі і метадалогіі сацыялогіі, а таксама ў сферы даследаванняў сацыялогіі рэлігіі, сацыялогіі права, медыяпрасторы, дыяспар і цяжкадаступных груп насельніцтва.


Погляды, выказаныя ў гэтым матэрыяле, з'яўляюцца адказнасцю аўтараў і не абавязкова адлюстроўваюць пазіцыю каманды Банка Ідэй